Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КРАСАВІК 20 1933 г. № 87 (4631)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Весьці за сабой масы. Н. КРУПСКАЯ—Ленін аб шаўках (2 стар.).

А. СУЧКОВА—Нарад № 1. (3 стар.).

СПРАВА АБ ШКОДНІЦТВЕ НА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯХ СССР (1 стар.).

Аб арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад у калгасах «Інтэрнацыянал» і «Набат»—Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б (1 стар.)

Падхапіць выклік каапэрацыі Рагачоўшчыны (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Паведамленьне агенцтва «Рэйтэр» (1 стар.).

Вобыск у кватэры супрацоўніка гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Гамбургу (1 стар.).

«Міззрныя людзі»—Італьянская газэта аб працэсе шкоднікаў 1 ст.).

ВЕСЬЦІ ЗА САБОЙ МАСЫ

У пастанове ЦК КП(б)Б, апублікаванай за ўчарашшым нумары «Зьвязды», даецца ацэнка работы ячэек калгасу «Пралетары» Капыльскага раёну і калгаса імя Сталіна Слуцкага раёну. Побач з ацэнкай работы пастановы дае рад важнейшых дырэктыў, акрэсьліваючых зьмест і формы работы на тольні гэтых дзьвёх ячэек, але і ўсіх партыйных арганізацый.

Студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), прамова т. СТАЛІНА на гэтым пленуме, пастанова ЦК УсеКП(б) аб ячэйках калгасаў «Искра» і «Вперед» далі разгорнутую праграму работы на вёсцы для кожнай партыйнай арганізацыі. Аднак, ня ўсюды яшчэ перабудавалі работу ў адпаведнасьці з гэтымі вычэрпальнымі ўказаньнямі. Аб гэтым гавораць хоць-бы факты з практыкі ячэйкі калгасу «Пралетары».

Кіраўніцтва ячэйкі, у прыватнасьці сакратар яе т. ЛАМАКІН, не зразумелі ўсёй вострасьці і важнасьці ўказаньняў тав. Сталіна, што «пераход да жалезнай гаспадаркі не памяншае, а па-ранейшаму нашы клопаты аб сельскай гаспадарцы, не памяншае, а павялічвае кіруючую ролю камуністаў у справе падняцьця сельскай гаспадаркі».

Не зразумеўшы гэтага, ячэйка калгасу «Пралетары», кіраўніцтва гэтай ячэйкі пусьцілі ўсё на самацёк, прыбраўшы да свайіх прарываў як у пэрыяд падрыхтоўкі да сяўбы, так і ў першыя дні сяўбы.

Ячэйка да гэтага часу ня выканала пастаўленай студзеньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) задачы «рашучага паляпшэньня палітычнай і гаспадарчай работы нашых ячэек у калгасах і саўгасах». Ячэйка не ажыцьцявіла канкрэтнага кіраўніцтва вытворчым жыцьцём, не разгарнула масава-палітычнай работы сярод калгаснікаў. «Ня гледзячы на наяўнасьць у дзьвёх брыгадах па тры камуністы, а ў адной брыгадзе 6 камуністаў, ячэйка не арганізавала пар'ыйных груп і партыйных арганізатараў, не забясьпечыла палеводчую брыгаду сыстэматычным партыйным кіраўніцтвам» (з пастановы ЦК КП(б)Б). Пры такой рабоце, пры такім кіраўніцтве на можа быць і гутаркі аб арганізацыйна-гаспадарчым і палітычным умацаваньні калгасаў.

Урокі ячэйкі калгасу «Пралетары» павінны быць улічаны ўсімі сельскімі, калгаснымі і саўгаснымі ячэйкамі, усімі партыйнымі арганізацыямі. Імя на цяпер, у пэрыяд разгортваньня масавай сяўбы трэба прэвярыць, наколь ні выконваюцца дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб 22 сакавіка, што ПЫТАНЬНІ ВЫТВОРЧАГА ЖЫЦЬЦЯ КАЛГАСАЎ (стварэньне пастаянных брыгад, падбор брыгадзіраў, зьвяньнявых, вучотчыкаў, арэатых, сейбітаў, конюхаў, нормаваньне аплаты працы, догляд каня, якасьць поўрыва, сяўбы, уборкі, працоўная дысцыпліна і інш.) СКЛАДАЮЦЬ АСНОЎНЫ ЗЬМЕСТ РАБОТЫ ЯЧЭЙКІ.

Трэба набліжаць кіраўніцтва да брыгады. Гэта—галоўнае і рашаючае. У барацьбе за ператварэньне ўсіх калгасаў у бальшавіцкія, а ўсіх калгаснікаў у заможных, у барацьбе за мацную працоўную дысцыпліну ў калгасах, за заваёўваньне большасьці калгасаў, у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці—задача ўмацаваньня вытворчай брыгады павінна стаць у цэнтры ўвагі партыйных ячэек, палітаддзелаў і райкомаў партыі. Ячэйкі павінны падыйсьці шчыльна да жыцьця калгаснай брыгады, добра ведаць кожнага ў паасобку калгасніка, ведаць, як ён працуе, як ён еў, як ён сее, як ён адносіцца да каня, машыны і г. д.

У сувязі з гэтым асабліва важнае значэньне набывае пытаньне аб масава-палітычнай рабоце ў брыгадзе, аб вядучай ролі камуністаў. «На пэрыяд весенняй сяўбы,—гаворыцца ў пастанове ЦК УсеКП(б) ад 22 сакавіка,—ячэйкі па вёсцы вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па масава-палітычнай рабоце ў полі (пагалоўнае ўцягненьне ў масавыя работы на полі камуністаў і камсамольцаў, правільная расстаноўка іх па брыгадах, прыцягненьне настаўніцтва, арганізацыя сацспаборніцтва, ударных брыгад, чырвоныя і чорныя дошкі, выданьне палявых насьцянгазэт, калектыўная чытка газэт, гутаркі, вытворчыя нарады)».

Уся масавая работа ў полі павінна завастрацьь увагу на пасьпяховым выкананьні сяўбы, на выпраўленьні на ходу недахопаў, на барацьбе з варожай агітацыяй. Праз масавую работу трэба выкрываць подыра, шкодніка, адзначаць перадавога, добрасумленнага калгасніка.

Яшчэ ў вельмі многіх ячэйках масава-палітычная работа ў брыгадзе надзвычай слабая, неканкрэтная, нядзейсная. Таму пастанова ЦК КП(б)Б аб ячэйках калгасаў «Пралетары» і імя Сталіна абавязвае ўсе партыйныя ячэйкі калгасаў узмацніць і шырока разгарнуць масавую палітычную работу ў адпаведнасьці з указаньнямі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Пастанова ЦК КП(б)Б з усёй вострасьцю ставіць пытаньне аб барацьбе ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ. Справа ў тым, што многія ячэйкі, многія камуністы і камсамольцы яшчэ да гэтага часу не ўсьвядомілі простай і непасрэднай сувязі кулацкага супраціўленьня кулацкай барацьбы супроць калгасаў з праяўленьнямі дробна-буржуазнай разбэшчанасьці, разгільдзяйства і недысцыплінаванасьці, не зразумелі ўсёй вялізарнай шкоды, якую прыносяць подыры і рвачы, не зразумелі таго, што дрэнная работа аднэй часткі калгаснікаў губіць і зьнішчае добрую работу астатніх калгаснікаў і ўсяго калгасу ў цэлым. Яркім прыкладам гэтага зьяўляецца той-жа калгас «Пралетары» Капыльскага раёну. Гэты калгас, які мае пепшую ў раёне глебу, атрымлівае горшыя ў раёне ўраджаі з-за безгаспадарнасьці, з-за адсутнасьці моцнай працоўнай дысцыпліны, з-за дрэннай арганізацыі працы.

А камуністы? Частка камуністаў у гэтым калгасе (ВАРАНЦОЎ, ЯЎСЮК, ПРАХАРЭНКА, ФЯДОТАЎ і інш.) подырычаюць, сыстэматычна спазьняюцца на работу, п'янствуюць. Бюро ячэйкі прапускае ўсё гэта скрозь пальцы, зусім не рэагуе на недапушчальнае паводзіны элемэнтарных прынцыпаў партыйнасьці.

Партыйныя ячэйкі павінны цьвёрда і рашуча змагацца за выкананьне ўсімі членамі і кандыдатамі партыі дырэктыў ЦК аб павышэньні адказнасьці членаў партыі за вытворчым жыцьцём калгасу, АБ АБАВЯЗКУ КОЖНАГА КАМУНІСТА ПАКАЗАЦЬ УЗОРЫ РАБОТЫ ў догляде каня, інвэнтару, у барацьбе за ўраджайнасьць, у рабоце на полі і г. д.

Усе мерапрыемствы ячэйкі, якімі-б яны добрымі ні былі, зьвядуцца да нуля, калі кожны камуніст у паасобку не ўсьвядоміць сваёй вядучай ролі, ролі перадавіка-вытворца, байца—арганізатара мас. Трэба памятаць указаньне нашага правадыра тав. Сталіна, што камуніст не павінен ганарыцца сваёй партыйнасьцю, а прыслухоўвацца да голасу беспартыйных, вучыць іх і ў іх вучыцца.

Але для таго, каб камуніст мог выканаць сваю ролю байца арганізатара, патрэбны дзьве ўмовы.

ПЕРШАЯ—правільна расставіць камуністаў і гэтым забясьпечыць арганізую чы ўплыў ячэйкі на рашаючых участках вытворчасьці: догляд коняй, воры ва, сяўба, улік працы, ахова калгаснай уласнасьці і г. д.

ДРУГАЯ—палітычна выхоўваць каму ністаў, «штодзённа дапамагаць кожнаму члену ячэйкі, у асаблівасьці кандыдатам партыі. У выкананьні імі партыйных абавязкаў і заданьняў ячэйкі, сыстэматычна правяраючы іх работу, рэгулярна скліканць агульныя сходы ячэйкі, абгаварваючы на іх вытворчыя пытаньні калгасу і справаздачы камуністаў па даручанай ім рабоце, забясьпечваючы выхаваўчы ўплыў бальшавіцкага калектыву на кожнага члена ячэйкі» (Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 22 сакавіка).

Арганізацыя моцнага бальшавіцкага ядра на рашаючых вучастках калгаснай вытворчасьці, выхаваньне кожнага члена і кандыдата партыі ў паасобку зьяўляецца рашаючай умовай заваяваньня большасьці калгаснікаў, умовай згуртаваньня беспартыйнага актыву з лепшых, праверанных на рабоце і ў барацьбе з кулаком калгаснікаў.

Беспартыйны калгасны актыў—гэта прыводны пас да шырокай масы калгаснікаў. Трэба гэты актыў ведаць, прыцягваць яго на адчыненыя партыйныя сходы, працаваць з ім, дапамагаць яму і падтрымліваць яго ў барацьбе супроць кулёў, прапушчыкаў, эпадзеяў, аб ядаючых калгас і раскрадваючых рэзультаты працы сумленных і адданых калгаснікаў.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб дзьвёх ячэйках проста ўказвае, што «ў правядзеньні ўсёй работы па сяўбе і ўмацаваньні калгасу ячэйка павінна арганізаваць калгасны актыў, весьці з ім сыстэматычную працу з тым, каб на ўсіх рашаючых вучастках калгасу (брыгады, СТФ), мець асноўнае ядро калгаснікаў-ударнікаў, як апора ячэйкі ў барацьбе за ўмацаваньне калгасу. Выкарыстаць увесь актыў ячэйкі, КСМ і на стаўнікаў па арганізацыі працы з калгасным актывам».

Гэта дырэктыва, даная ячэйцы імя Сталіна Слуцкага раёну, адносіцца да ўсіх ячэек калгасаў. Задача райкомаў і палітаддзелаў—змагацца за выкананьне гэтага важнейшага ўказаньня ЦК КП(б)Б, памятаючы словы тав. Сталіна, што «СІЛА БАЛЬШАВІКОЎ, СІЛА КАМУНІСТАЎ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ЯНЫ ЎМЕЮЦЬ АКРУЖАЦЬ НА ШУ ПАРТЫЮ МІЛЬЁНАМІ БЕСПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ».

Разгортваючы работу ўнутры калгасаў, згуртоўваючы там моцны калгасны актыў, нельга ні на мінуту забыць аб аднаасобніку—заўтрашнім калгаснім. СКІДВАНЬНЕ АДНААСОБНІКА З РАХУНКУ, ІГНАРАВАНЬНЕ ЯГО «ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА СПРАВАЙ, ЯКАЯ ДА ПАМАГАЕ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ Ў БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ НАС» (з пост. ЦК КП(б)Б.). Задача парт'ячэек—ахапіць сваім кіраўніцтвам і ўплывам кожную аднаасобную гаспадарку.

АБ КІРАЎНІЦТВЕ РАЙКОМАЎ. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове канстатаваў, што Капыльскі і Слуцкі райкомы не аказваюць належнай практычнай дапамогі ў штодзённай рабоце ячэек і пра пазваў райкомам і палітаддзелам МТС канцэнтраваць сваю ўвагу на аказаньні дапамогі калгасным ячэйкам, устанаўленьні справаздачнасьці і адказнасьці членаў бюро і работнікаў райкомаў, прымаючых да ячэек.

Мы маем у сучасны момант у вёсцы вялікія сілы. Мы стварэм палітаддзелы, а ў радзе месц яны ўжо разгарнулі работу. У нас ёсьць усе магчымасьці для таго, каб завяваць першынства ў выкананьні пляну весенняй сяўбы, у нас ёсьць усе магчымасьці для таго, каб атрымаць вялікія перамогі ў барацьбе за бальшавіцкія калгасы. Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б мы гэтыя перамогі будзем мець!

АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПАСТАЯННЫХ ВЫТВОРЧЫХ БРЫГАД У КАЛГАСАХ „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ", ГОМЕЛЬСКАГА Р-НУ, „НАБАТ", ТАЛАЧЫНСКАГА Р-НУ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Абсьледваньне справы арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад у калгасах «Інтэрнацыянал» і «Набат», праведзенае ЦК КП(б)Б, выявіла наступнае:

I.

Калгас «Інтэрнацыянал», Гомельскага раёну (аб'яднае 84 гаспадаркі). Калгас з посьпехам правёў 1932 гаспадарчы год, мае партыйнае ядро ў 11 чал. і камсамольскае — у 18 чал., поўнасьцю ссыпаў і адсартаваў насенныя фонды, добра падабраў брыгадзіраў: з 6 брыгадзіраў — 2 члены партыі, астатнія да ўступленьня ў калгас — беднякі, як работнікі, карыстаюцца аўтарытэтам.

Ня гледзячы на наяўныя магчымасьці, калгас вельмі нездавальняюча вядзе падрыхтоўку да весенняй сяўбы, бо:

а) увесь прападзольны склад калгасу яшчэ не размяркаваны па брыгадах. Людзі, якія лічацца ў палеводчых брыгадах, заліваны, апрача таго, для работы па жывёлагадоўлі, будаўніцтву і наадварот;

б) фуражныя насенныя фонды не размеркаваны па брыгадах, інвэнтар поўнасьцю не падрыхтован, збруя не падагнана да кожнага каня;

в) ня вылучаны вытворчыя вучасткі для брыгад на ўвесь тэрмін сеязвароту, культуры па брыгадах размеркаваны механічна — пароўні. Адсутнічаюць гадавыя вытворчыя заданьні ў брыгадзе, нормы выпрацоўкі не абгаварваліся, тэрміны сяўбы не даведзены да брыгад;

г) устаноўлена няправільная сыстэма аплаты брыгадзіраў (дабаўленьне чвэрткі працадня за брыгадзірства). Ня ма ўлікі работы брыгад з работай трактарнага атраду МТС.

ЦК прапануе ячэйцы калгасу «Інтэрнацыянал» правесьці наступнае:

1. Замацаваць з весны 1933 году за кожнай брыгадай вытворчы вучастак на ўвесь час сеязвароту, выходзячы з задачы забясьпечыць найбольш адказныя вучасткі сяўбы (апрацоўка глебы, сяўба) вопытнымі праверанымі калгаснікамі.

2. Размеркаваць фуражныя фонды па брыгадах, улічваючы колькасьць і сытасьць коняй у кожнай з іх. Размеркаваць насенныя фонды па брыгадах, выходзячы з заданьняў і ўстаноўленых норм высеву.

3. Выпачаць дакладныя тэрміны правядзеньня ўсіх палявых работ, зьвязаных з сяўбой, каб забясьпечыць скончаньне сяўбы ў максымальна сьціслыя тэрміны, у прыватнасьці ў асноўным закончыць сяўбу аўса да 25 красавіка.

4. Кіруючыся ўстаноўленымі НКЗ прынятымі нормамі і расцэнкамі, абгаварыць на брыгадных нарадах і ўстанавіць цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, выходзячы з канкрэтных умоў калгасу, увязаўшы барацьбу за высокія нормы выпрацоўкі з барацьбой за якасныя паказальнікі выкананьня па кожнаму віду работ.

Окасаваць уведзеную калгасам няправільную сыстэму аплаты працы брыгадзіраў. Аплату брыгадзіраў праводзіць у дакладнай адпаведнасьці з пастановай НКЗ СССР ад 28 лютага і НКЗБ ад 4 сакавіка 1933 году.

II.

Калгас «Набат», Талачынскага раёну (аб'яднае 34 гаспадаркі). Па заяве раённых арганізацый калгас зьяўляецца адным з лепшых па арганізацыі вытворчых брыгад. У калгасе арганізацыя пастаянных вытворчых брыгад к моманту абсьледваньня ня была праведзена:

а) брыгады існуюць толькі на паперы, самое размеркаваньне калгасьніка паміж дзьвюма брыгадамі праведзена мэханічна — пароўні;

б) вытворчыя вучасткі для вылучаны і не замацаваны за брыгадамі, зэдтальне па пасеве таксама размеркавана мэханічна — пароўні, прычым пасеў гародніх культур, кораньплодаў і папаранае поле не прымацаваны ні да аднэй брыгады;

в) пятавая сіла, інвэнтар, насенныя і фуражныя фонды не размеркаваны і ня выданы брыгадам, коні і інвэнтар не замацаваны за асобнымі калгаснікамі;

г) вытворчы плян калгасу па асобных культурах прадугледжвае зьніжэньне ўраджайнасьці: па ячмені фактычны ўраджай у 1932 годзе атрыман 13,5 цэнтн. з га, а па пляну 1933 году прадугледжана 9,5 цэнтн. з га, па сёмасных культурах з аднаго га ў 1932 годзе атрымана 600 цэнтн., па пляну 1933 г. намечана 500 цэнтн.;

г) гадавыя вытворчыя заданьні па брыгадах ня складзены, брыгады і калгаснікі ня ведаюць аб тэрмінах сяўбы і іншых работ. Нормы выпрацоўкі па калгасу не абгаварваны і ня прыняты. Калгас ня ведае, якія работы будуць выкананы МТС, бо апошняя не давяла свайго пляну да калгасу;

д) з боку загадчыка вытворчай часткі МТС Аўдошкава па пытаньні арганізацыі брыгад на агульным сходзе калгаснікаў дана шкодніцкая ўстаноўка аб арганізацыі аднэй брыгады з лепшых калгаснікаў, а другой брыгады — з лодыроў.

ЦК прапануе ячэйцы калгасу «Набат»:

1. Перагледзець вытворчы плян у частцы паказальнікаў па ўраджайнасьці, забясьпечыўшы далейшы рост ураджайнасьці па ўсіх культурах супроць 1932 году.

2. Бездакладна замацаваць цягавую сілу і інвэнтар за брыгадамі і асобнымі калгаснікамі на ўвесь год.

3. Пры камплектаваньні брыгад паставіць асноўны ўпор на такі падбор у брыгадзе асноўнага ядра праверных, дысцыплінаваных калгаснікаў-ударнікаў, які-б забясьпечыў высокую працоўную дысцыпліну ўсёй брыгады ў цэлым.

4. Папаранае поле, землі пад гароднымі культурамі і кораньплодамі ўключыць у брыгадныя зямельныя вучасткі.

5. За яўна шкодніцкую ўстаноўку па пытаньні арганізацыі брыгад загадчыка вытворчай часткі МТС Аўдошкава зьняць з работы і прыцягнуць да судовай адказнасьці.

III.

1. ЦК лічыць абсалютна неняпрымым, зрываючым посьпех весенняй сяўбы, механічны падыход да пытаньняў арганізацыі брыгад, прымацаваньня да іх вытворчых вучасткаў, паперова-бюракратычны падыход да размеркаваньня цягавай сілы і інвэнтару па брыгадах і прымацаваньне іх да кожнага калгасніка.

2. ЦК прапануе пад персанальную адказнасьць сакратароў РК КП(б)Б і старшыні РВК:

а) бездакладна выпішчыць усе недахопы ў арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад у калгасах, забясьпечыўшы стварэньне і перабудову брыгад на падставе пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 9 сакавіка 1933 году в тым, каб к пачатку сяўбы ва ўсіх калгасах былі створаны сапраўды моцныя вытворчыя калгасныя брыгады;

б) перагледзець пляны з мэтай забясьпечыць далейшы рост ураджайнасьці па ўсіх культурах. Прыпяваць да самай строгай адказнасьці ўсіх вінаватых у такім плянаваньні, якое арыентуе калгасы на зьніжэньне ўраджайнасьці супроць дасягнутых вынікаў 1932 году.

3. Выходзячы з вопыту раённай сяўбы, ЦК прапануе:

а) дабіцца таго, каб кожная брыгада, кожны калгаснік брыгады загадзя ведалі сеязваварот калгасу, зямельны вучастак брыгады і тыя работы, якія павінны быць на ім праведзены;

б) пры ворыве і баранаваньні пускаць наперад лепшых аратых і баранавальшчыкаў, з тым, каб па ім раўняліся іншыя калгаснікі і брыгады;

в) загадзя разьбіць брыгады на зьвеньні. Арганізаваць работу зьвеньняў і асобных калгаснікаў на падставе сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва;

г) стварыць у брыгадах партыйна-камсамольскае ядро, падпадаючы на арганізацыйна-кіраўнічай рабоце калгасу мінімальна неабходную колькасьць камуністаў і камсамольцаў.

4. ЦК прапануе МТС, пад адказнасьць дырэктароў, бездакладна давесьці плян работы вытворчых вучасткаў МТС да кожнага абслугоўваемага ёю калгасу і ўзяць пад свой нагляд справу арганізацыі вытворчых брыгад у калгасах і ўзаімку іх работы з трактарнымі атрадамі.

Справа аб шкодніцтве на электрастанцыях СССР

З ПРЫГАВАРУ АСОБАГА ПРЫСУЦТВА ВЯРХОЎНАГА СУДА СССР

ад 19 красавіка

Данымі папярэдняга і судовага сьледзтва спэцыяльнае прысуцтва Вярхоўнага суда СССР устанавіла наступнае:

На працягу раду год на буйных электрастанцыях Саюзу ССР, на электрастанцыях, уваходзячых у сыстэму Масэнэрга, Златаустаўскай, Челябінскай, Іваўскай, Бакінскай і іншых мелі месца сыстэматычныя аварыі асобных катлоў, ротараў турбін, генэратараў і г. д., выводзіўшыя іх са строю на больш ці мекш доўгія тэрміны, паніжаючы ма тутнасьць электрастанцый. Створаная камісія папярэдняга сьледзтва і выкліканая судовым пасяджэньнем спэцыяльная тэхнічная экспэртная камісія на аснове прадстаўленых імі даных, прышлі да заключэньня аб наяўнасьці ва ўсіх абсьледаваных выпадках аварый або злачынной неахайнасьці, або проста га шкодніцтва з боку тэхнічнага пэрсаналу, абслугоўваючага пералічаныя станцыі.

На аснове прайшоўшага перад судом матар'ялу судовага сьледзтва, суд устанаўляе, што прычынай паказаных аварый была шкодніцкая дзейнасьць контр-рэвалюцыйнай групы, якая складалася з дзяржаўных служачых электрастанцый, у большасьці з вышэйшага тэхнічнага пэрсаналу, дзейнічаўшых разам з некаторымі служачымі прыватнай ангельскай фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс», працуючай у СССР па дагаворы з Наркамцяжпрамам аб аказаньні тэхнічнай дапамогі. Сярод служачых «Мэтрапалітэн-Вікерс» кіруючая роля ў контр-рэвалюцыйных злачынствах належала Тарнтону—галоўнаму мантажнаму інжынэру гэтай фірмы і пад кіраўніцтвам якога ажыцьцяўлялі шкодніцтва на асобных электрастанцыях СССР і інжынэры і мацёры фірмы, ангельскія падданыя—Макданальд і Нордвол а таксама і інжынэр Кушні і грамадзянін СССР—мацёр фірмы Алейнік. Праз гэтых асоб, як таксама і непасрэдна, Тарнтон: а) уступіў у сувязь з контр-рэвалюцыйнымі групамі дзяржаўных савецкіх служачых на электрастанцыях, дагаворваўся з імі (Гусеў, Сухаручкін, Зорын) па ўчыненьні аварый, па ўтойваньні дэфэктаў абсталяваньня, пастаўляемага фірмай «Мэтрапалітэн-Вікерс» (Крашэньнікаў, Зівэрт) і даваў хабары дзяржаўным служачым за зробленыя імі злачынныя дзеяньні; б) займаўся ваенным шпіянажам на тэрыторыі СССР, збіраючы праз Макданальда, Кушні і Алейніка сакрэтныя весткі ваеннадзяржаўнага значэньня і даваў за атрыманыя весткі праз паказаных асоб хабары савецкім служачым (Гусеў, Сокалаў і інш.). Упаўнаважены Маскоўскай канторы фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс» Маніграуз быў асьведомлен аб дзеяньнях Тарнтона па арганізацыі і прымаў удзел у дачы хабараў дзяржаўным служачым электрастанцый. Кутузава, будучы на службе ў Маскоўскай канторы фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс» у якасьці сакратара і ведаючы аб контр-рэвалюцыйнай рабоце служачых гэтай фірмы, сыстэматычна перадавала і перасылала грашовыя ўзнагароды асобным удзельнікам контр-рэвалюцыйнай групы дзяржаўных савецкіх служачых электрастанцый за іх шпіёнскую і шкодніцкую дзейнасьць. Выходзячы з устаноўленых судом акалічнасьцяй справы і ступені віны кожнага і на падставе пастановы ЦВК Саюзу ССР ад 14 сакавіка гэтага году, у сілу якой савецкія дзяржаўныя служачыя, выкрытыя ў шкодніцтве, як здраднікі сваёй бацькаўшчыны, падлягаюць больш суровай адказнасьці, чым служачыя прыватных прадпрыемстваў,—суд прыгаварыў:

1) ГУСЕВА ВАСІЛЯ АЛЯКСЕЕВІЧА,

2) СУХАРУЧКІНА ЛЕАНІДА АЛЯКСЕЕВІЧА,

3) ЛАБАНАВА АЛЯКСАНДРА ЦІМАФЕЕВІЧА—дзяржаўных служачых, грамадзян СССР—ДА 10 ГОД ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ З ПАРАЖЭНЬНЕМ У ПРАВОХ НА 5 ГОД І З КАНФІСКАЦЫЯЙ УСЁЙ МАЕМАСЬЦІ. Выбар гэтай меры рэпрэсій замест расстрэлу суд упрунтоўвае выключна тым, што злачынная шкодніцкая дзейнасьць паказаных асуджаных мела лёкальны характар і не нанесла сур'ёзнай страты прамысловай магутнасьці СССР.

4) СОКАЛАВА ВАСІЛЯ АНДРЭЕВІЧА,

5) ЗОРЫНА МІКАЛАЯ ГРЫГОР'ЕВІЧА,

6) КАТЛЯРОЎСКАГА МАЙСЕЯ ЛЬВОВІЧА—дзяржаўных служачых, грамадзян СССР—на тых-жа падставах —ДА 8 ГОД ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ З ПАКАЗАНЬМІ ВЫШЭЙ ВЫНІКАМІ.

7) КРАШЭНЬНІКАВА МІХАІЛА СЯРГЕЕВІЧА—дзяржаўнага служачага, грамадзяніна СССР—на тых-жа падставах —ДА 5 ГОД ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ З ПАРАЖЭНЬНЕМ У ПРАВОХ НА 5 ГОД БЕЗ КАНФІСКАЦЫІ МАЕМАСЬЦІ.

8) ЛЕБЕДЗЕВА ВЕЧАСЛАВА ПЯТРОВІЧА—дзяржаўнага служачага, грамадзяніна СССР,—прымаючы пад увагу, што ён зьяўляўся тольні зброяй у руках Лабанава і, кіруючыся артыкулам 51 крымінальнага кодэксу РСФСР, — ДА 2 ГОД ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ БЕЗ ПАРАЖЭНЬНЯ ПРАВОЎ І БЕЗ КАНФІСКАЦЫІ МАЕМАСЬЦІ.

Служачых Маскоўскай канторы фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс»:

9) Ангельскага падданага ТАРНТОНА ЛЕСЬЛІ ЧАРЛЬЗА—ДА ТРОХ ГОД ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ.

10) У адносінах ангельскага падданага МАКДАНАЛЬДА ВІЛЬЛЯМА ЛІОНЭЛЬ, як дзейнічаўшага па простым падбухторваньні яго непасрэдным начальнікам Тарнтонам—з аднаго боку і з прычыны чыстасардэчнага прызнаньня на судзе сваіх злачынных дзеяньняў, кіруючыся артыкулам 51 крымінальнага кодэксу РСФСР, зьмякчыць патрабуемую законам меру рэпрэсій і абмежавацца асуджэньнем ДА 2-Х ГОД ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ.

У адносінах ангельскіх падданых:

11) МАНКГАУЗА АЛЛАНА,

12) НОРДВОЛА ЧАРЛЬЗА, як ня прымаўшых непасрэднага ўдзелу ў арганізацыі аварый на электрастанцыях і

13) КУШНІ ДЖОНА, з прычыны даўнасьці зробленага ім злачынства (1928 г.), кіруючыся артыкулам 51 КК РСФСР, абмежаваць ВЫДАЛЕНЬНЕМ ІХ ЗА МЕЖЫ СССР З ЗАБАРОНАЙ УЕЗДУ Ў СССР ТЭРМІНАМ НА 5 ГОД.

Асуджаныя Маніграуз, Нордвол і Кушні абавязаны пакінуць межы СССР на працягу трох сутак з моманту вынясеньня прыгавору.

14) АЛЕЙНІКА ПЯТРА ЕРАМЕЕВІЧА—грамадзяніна СССР, прымаючы пад увагу яго залежнасьць па службе ад Тарнтона і як служачага прыватнай фірмы—да 3 год пазбаўленьня волі БЕЗ ПАРАЖЭНЬНЯ Ў ПРАВОХ І БЕЗ КАНФІСКАЦЫІ МАЕМАСЬЦІ.

15) КУТУЗАВУ АННУ СЯРГЕЕЎНУ, грамадзянку СССР, на тых-жа падставах—ДА ПАЎТАРА ГОДА ПАЗБАЎЛЕНЬНЯ ВОЛІ БЕЗ ПАРАЖЭНЬНЯ Ў ПРАВОХ І БЕЗ КАНФІСКАЦЫІ МАЕМАСЬЦІ.

Усім асуджаным да пазбаўленьня волі залічыць тэрмін папярэдняга зьняволеньня.

16) У адносінах ЗІВЭРТА ЮЛІЯ ІВАНАВІЧА—дзяржаўнага служачага, грамадзяніна СССР, прымаючы пад увагу, што сваёй работай пасьля 1931 году ён паказаў, што шчыра парваў са шкоднікамі, на падставе артыкулу 8 КК РСФСР, МЕР РЭПРЭСІЙ НЯ ПРЫМАЦЬ І З-ПАД ВАРТЫ ВЫЗВАЛІЦЬ.

17) ГРЭГОРЫ АЛЬБЕРТА ВІЛЬЯМА, ангельскага падданага, з-за невыстарчальнасьці ўлік АПРАЎДАЦЬ.

Прыгавор канчатковы, абскарджаньню не падлягае і ўваходзіць у сілу неадкладна з моманту яго агалошэньня.

СТАРШЫНЯ СПЭЦЫЯЛЬНАГА ПРЫСУЦТВА ВЯРХОЎНАГА СУДА САЮЗУ ССР В. УЛЬРЫХ.

ЧЛЕНЫ ПРЫСУЦТВА:

Л. МАРТЭНС, ДЗЬМІТРЫЕЎ.

Гор. Масква, 19 красавіка 1933 г.

1 гадз.

Пасьля прачытаньня прыгавору старшыня тав. Ульрых аддаў распараджэньне на камэнданту суда ўзяць падсудных Тарнтона пад варту, а абвінавачанага Зівэрта вызваліць з-пад варты і сакратару суда—узяць падпіску ад падсудных Нордвола, Маніграуза і Кушні аб выезьдзе з СССР у трохдзённы тэрмін з моманту прачытаньня прыгавору.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ, АГЕНЦТВА „РЭЙТЭР"

ЛЁНДАН, 19. (БЕЛТА). «Рэйтэр» паведамляе: «Сёньня пасьля поўдню будзе выпушчана спэцыяльнае выданьне афіцыяльнага вестніка («Афішызл газэта»), дзе будзе апублікавана пастанова, якая забараняе імпарт з Расіі многіх тавараў, у тым ліку масла, збожжа, бавоўны-сыраду, нафты і лесу. Гэтыя прадметы становяць прыблізна 80 проц. усяго імпарту з Расіі ў Англію. Выбар мэтаду пералічэньня пэўных найбольш важных тавараў у пастанове тлумачыцца тым, што ўвесьці эмбарго на гэтыя тавары куды прасьцей, чым абвясьціць эмбарго на ўвесь імпарт з Расіі. Эмбарго ўвойдзе ў сілу праз тыдзень, лічачы ад сёньняшняга дня, з прычыны таго, што ў дарозе ўжо знаходзяцца партыі рускіх тавараў, якія належаць брытанскім пакупцом».

Паводле вестак агенцтва, дыпляматычная недатыкальнасьць 3-х кіруючых членаў савецкай гандлёвай дэлегацыі канчаткова страціла сілу. Гэтыя асобы і службовыя памяшканьні, якія імі зайдаюцца, такім чынам не карыстаюцца больш адпаведнымі прывілеямі. Сёньня раніцай савецкі паўпрэд МАЙСКІ бачыўся з САЙМОНАМ у міністэрстве замежных спраў.

***

ЛЁНДАН, 19. (БЕЛТА). Паведамляюць, што, «пастанова, якая забараняе імпарт савецкіх тавараў, напісана і будзе ўвечары апублікавана ў якасьці спэцыяльнага дадатку ў «Лёндан газэт».

„Міззрныя людзі"

Італьянская газэта аб працэсе шкоднікаў

РЫМ, 18. (Белта). Лёнданскі карэспандэнт «Стампа» паведамляе, што некаторыя ангельскія колы, якія чакалі ад падсудных ангельскіх «гераічных шкоднікаў», запугалісь. «Міззрныя», кажуць мікраскапічныя,—сіліла карэспандэнт,—сталі падсудным як перад судзьдзямі, так і перад сусьветнай грамадзкай думкай». Карэспандэнт далей падкрэсьлівае, што Манкгаўз, выкуплены быў пакрасіць прабачэньня ў суда і прызнаць, што яго паведамленьні аб працэсе шкоднікаў допыту былі няправільнымі, прычым гэта прызнаньне было дано добраахвотна.

Вобыск у кватэры супрацоўніка гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Гамбургу

БЭРЛІН, 19. (БЕЛТА). Учора на кватэру супрацоўніка Гамбургскага ад'ізьненьня гандлёвага прадстаўніцтва т. КОГАНА зьявіліся 2 паліцэйскіх чыноўнікі і зрабілі ў яго адсутнасьці вобыск. Вобыск ня даў ніякіх вынікаў. Пратакол аб вобыску ня быў складзен. Генконсульства СССР у Гамбургу заявіла пратэст супроць вобыску.

Гвалтоўныя дзеяньні паліцыі і японскіх улад

ХАБАРАЎСК, 17. У сувязі з гвалтоўнымі дзеяньнямі паліцыі і японскіх улад на станцыі Манчжурыя, Кітайска-Ўсходняй чыгункі,

АСВАЕНЬНЕМ НОВЫХ НОРМ СУСТРЭНЕМ ГАДАВІНУ СОЦСПАБОРНІЦТВА

3 850 рабочых 700 спаборнічаюць

Новым уздымам працоўнага энтузіязму, узмацненьнем барацьбы за прамфінплян, за выкананьне якасных паказальнікаў і асваеньне новых норм адзначае чацьвертую гадавіну сацспаборніцтва і ўдарніцтва калектыў кандытарскай фабрыкі «КАМУНАРКА».

«Камунарка» — найбольш магутнае предпрыемства ва ўсёй сыстэме прамысловасьці Наркомхарчу БССР. Перадавыя цэхі і брыгады горача адгукнуліся на адозву ленінградзкіх рабочых, на адозву заводу імя Варашылава, прынялі на сябе рад канкрэтных самаабавязацельстваў і высунулі сустрэчныя пляны.

Карамельны цэх пры прапрацоўцы адозвы ленінградцаў абавязаўся да дня гадавіны сацспаборніцтва і 1-га мая даць звыш пляну 25 ТОН карамелі, мякка-шакаладны цэх—6 ТОН, дражэйны — 5 ТОН. Мэханічны цэх пускае канвэер да штампавачнай машыны і дадаткова здае ў эксплёатацыю 2 завёртачныя машыны.

3 850 чалавек, працуючых на «Камунарцы» — 700 ахоплена сацспаборніцтвам. Разгортваецца спаборніцтва паміж асобнымі цэхамі, брыгадамі, ударнікамі на лепшае выкананьне сустрэчнага. Упераадзе мякка-шакаладны цэх, які моц на трымае пераходны сьцяг. На фабрыцы ідзе барацьба за асваеньне і перавыкананьне новых форм. Напрыклад, па групе варшчыкаў старая выніканая норма была 1.600 кілгр. у зьмену на чалавека, новая 2.112. Фактычна выпрацавана 2.218, перавыкананьне старой нормы на 42 проц. новай — на 7 проц., рабочыя на адліўцы перавыканалі новую норму на 7 проц., на аднатцы — на 3 проц., на лінейнай машыне № 3 — на 1,2 проц., штампоўшчыкі — на 4 проц. Брыгады завёртніц — ЯМНІК, ТАРАСЕВІЧ, ПАДАСТРОВЕЦ І ПЕРЧЫК, абгаварыўшы новыя нормы ТНВ, добраахвотка павялічылі іх па 5 кілгр. на кожны гатунак.

Партарганізацыя «Камунаркі» і фабком, якія за апошні час некалькі папепшылі кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, павінны яшчэ больш узмацніць увагу да гэтага вучастку работы, даваць гаспадарча-разрахунковым брыгадам і ўдарнікам больш штодзённай практычнай дапамогі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну і ўзятых па кандагаворы самаабавязацельстваў.

Найбольш адстапы вучастак у кіраўніцтве сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам — неналаджанасьць дакладнага ўліку, эфэктыўнасьці, часам нячутныя адносіны да запатрабаваньняў пасобных ударнікаў, усё яшчэ слабое кіраўніцтва гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі. Так, напрыклад, брыгадзе т. ГУТ (мякка-шакаладны цэх) ня выплачана за тры месяцы прэмія за эканомію. Загадчык цэху тав. ШЭЙНІН усё ня можа высьвятліць, ці была сапраўды эканомія. Не вядзецца належнай работы па выяўленьні і ачыстцы радоў ударнікаў ад імітэ-ўдарнікаў.

У дні падрыхтоўкі да IV гадавіны сацспаборніцтва і ўдарніцтва і 1-га мая гэтыя недахопы трэба ліквідаваць. Асабліва ўвага павінна быць аддана стварэньню ўмоў для асваеньня новых норм.

Н. Б.

Швэйная фабрыка „Кастрычнік" рыхтуецца да 4 гадавіны

У студзені месяцы 1933 году партыйныя і камсамольскія арганізацыі фабрыкі «Кастрычнік» абвясьцілі конкурс на лепшы агрэгат і лепшую брыгаду. Конкурс мабілізаваў увесь рабочы калектыў на барацьбу за высокаякаснае выкананьне пляну, за ўзьнаўленьне прадукцыйнасьці працы.

Выразна вызначыўся пералом у рабоце пасобных цэхаў.

Калі, напрыклад, у лютым месяцы гэтага году першы агрэгат знаходзіўся на чорнай дошцы ў сувязі з невыкананьнем пляну і дрэннай якасьцю выпускнай прадукцыі, дык ужо ў сакавіку месяцы дзьве істужкі першага агрэгату заносіцца на чырвоную дошку за перавыкананьне прамфінпляну і за ўзорную якасьць прадукцыі.

Увесь час ідзе наперадзе конкурсу трэці агрэгат, які ў колькасных і ў якасных адносінах дае лепшыя паказальнікі выкананьня пляну.

Асаблівую ролю адыгрываюць некаторыя брыгады ў справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва. У гэтым напрамку патрэбна адзначыць брыгаду **Дульневіча.** Гэта брыгада зьвярнулася з адозвай да ўсіх брыгад швэйных фабрык БССР аб найлепшай падрыхтоўцы да чацьвертай гадавіны сацспаборніцтва.

Брыгада **Дулькевіча** ў студзені месяцы выканала прамфінплян з прарывам (95,1 проц.). Але адразу былі мабілізаваны ўсе рабочыя на ліквідацыю гэтага прарыву і ў выніку гэтага за сакавік месяц плян выкананы на **105** проц. Брыгада абавязалася выканаць плян да 1 мая на **105** проц., а таксама зьнішчыць брак і пераробкі.

Астатнія брыгады фабрыкі павінны раўняцца па перадавой брыгадзе **Дулькевіча,** павінны падхапіць пачын лепшых ударнікаў ленінскага сацспаборніцтва.

Дасягнулі значных посьпехаў у выкананьні пляну брыгада трэцяга агрэгату другой зьмены на чале з тав. **Багамолавай** і брыгада другога агрэгату першай зьмены на чале з тав. **Цьнянскай.**

За лепшую пастаноўку работы (рамонт машын, уцюгоў, прэсаў), за свае часовы вынаход апарата для бабін, занесена на чырвоную дошку тэхнічная частка фабрыкі, якая забясьпечыла выкананьне пляну першага квартылу 1933 году.

У сувязі з падрыхтоўкай да гадавіны сацспаборніцтва ў кожным цэху арганізуюцца брыгады па праверцы становішча сацспаборніцтва і ўдарніцтва і выкананьня ўзятых абавязкаў. Арганізуецца таксама збор рабочых прапаноў.

Фабрычныя арганізацыі вызначылі мерапрыемствы для палепшэньня матар'яльнага становішча рабочых: **да 1 мая ў фабрычнай сталоўцы адкрываецца стол ударнікаў, разьлічаны на 56 рабочых.**

Але ў рабоце фабрычных арганізацый ёсьць і недахопы. Назіраецца некаторае паслабленьне ў сыстэматычным кіраўніцтве сацспаборніцтвам. Раней, у часе конкурсу, кожны пяць дзён зьбіралася камісія па праверцы выкананьня ўзятых кожным рабочым абавязкаў. У сучасны момант гэта работа ўжо не праводзіцца; у рабоце фабрычных арганізацый назіраюцца некаторыя кампанейскія тэндэнцыі, нясыстэматычнасьць у справе выяўленьня лепшых ударнікаў.

Па фабрыцы «Кастрычнік» надзвычайна слаба пастаўлена работа па ўцягненьні рабочых у грамадзка-палітычнае жыцьцё, што ў большасьці выпадкаў значна адлюстроўваецца на выкананьні прамфінпляну.

Пры належным кіраўніцтве з боку партыйных, камсамольскіх і прафарганізацый фабрыка «Кастрычнік» зможе адзначыць чацьвертую гадавіну ленінскага сацспаборніцтва жывымі фактамі канкрэтных дзеяньняў, рашучым палепшэньнем якасьці прадукцыі.

З. КАГАН.

САВЕЦКІ ГЕНЭРАТАР У 200 КВТ



На 16-й падстанцыі пракатнага цэху новага заводу інструмэнтальнай сталі Дніпракамбінату ўстаноўлен магутны генэратар савецкага вырабу ў 200 кілёват.

Такіх генэратараў на заводзе будзе тры.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА

Падхапіць выклік каапэрацыі Рагачоўшчыны!

ПЕРАТВАРЫЦЬ КОНКУРС У МАГУТНУЮ ЗБРОЮ БАРАЦЬБЫ ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ СЯЎБУ

ЗА ЖЫВУЮ, КАНКРЭТНУЮ СПРАВУ!

Веснавая сяўба пачалася ўжо. Яна зьяўляецца адказьнейшым палітычным экзаменам для ўсіх арганізацый. Пачатак сяўбы накладвае рад сур'ёзных абавязкаў і на спажывецкую каапэрацыю. **Савецкі гандаль павінен стаць вострай зброяй, накіраванай супроць кулака, шкодніка і гультая, зброяй, якая стымулюе, заахвочвае барацьбу лепшых перадавых калгасьнікаў і аднаасобнікаў за пасеўны плян.**

Сяўба пачалася. Гэта значыць, што сельскія спажывецкія таварыствы павінны на-ходу перабудаваць сваю работу. Разам з калгасамі высьці ў поле, дапамагчы калгасным брыгадам, наладзіць развозны гандаль, мабілізаваць усе рэсурсы для заахвочваньня ўдарнікаў сяўбы, арганізаваць грамадзкае харчаваньне ў калгасе і на полі, сурова праводзіць таварны байкот лодырам, прагульшчыкам і рвачом.

Грош цана такому спажывецкаму таварыству, якое стаіць у баку ад агульнай барацьбы за бальшавіцкую сяўбу, якое працуе старымі мэтадамі, не дапамагае ўздыму калгаснай вытворчасьці. Грош цана такой каапэрацыі, якая ня ўмее мабілізаваць масы пайшчыкаў, масы актыву на работу па-новаму «так, каб серца кожнага хварэла за агульную справу» (Са звароту ССТ в. Мачаха).

Спажывецкая сыстэма БССР, прыняўшы выклік **Мачахскага** сельспажыўтаварыства, уключылася ў конкурс на лепшае сельспажыўтаварыства па абслугоўваньні пасеўнай. Усебеларускі конкурс на лепшае ССТ ставіць перад кожнай нізавой каапэрацыйнай адзінкай баявую задачу— **пераўтварыць сельспажыўтаварыства ў арганізацыю, якая дапамагае ўздыму калгаснай вытворчасьці, якая паказовому ажыцьцяўляе** дырэктывы партыі аб культурным савецкім гандлі.

Учора мы зьмясьцілі адозву ўдарнікаў каапэрацыі і каапактыву Рагачоўскага раёну да ўсіх сельспажыўтаварыстваў БССР, да ўсіх актывістаў каапэрацыі.

У адозьве падкрэслена, што вясковая каапэрацыя ні ў якім разе не павінна стаяць у баку ад барацьбы за бальшавіцкія калгасы, за ўзорнае праведзеньне першай вясны другой пяцігодкі. Ударнікі каапэрацыі Рагачоўшчыны ўзялі на сабе канкрэтныя абавязацельствы: **забясьпечыць пераважнае снабжэньне лепшых калгасьнікаў і аднаасобнікаў; на працягу красавіка і мая выканаць 75 проц. квартальнага пляну таваразвароту ў размеры 1 млн. руб.; заключыць 500 сацыялістычных дагавораў з калгасамі, калгаснымі брыгадамі і групамі працоўных аднаасобнікаў; давесьці колькасьць развозак да 25; арганізаваць 10 палявых вагоў і 8 развозак гарачых страў і г. д.**

Для лепшага выкананьня ўсіх абавязацельстваў, зьлёт абвясьціў унутрыраённае сацыялістычнае спаборніцтва сельскіх спажывецкіх таварыстваў і выклікаў на спаборніцтва ССТ **Быхаўскага** раёну.

Ударнікі каапэрацыі Рагачоўшчыны ўступілі ў бой за бальшавіцкую вясну. Іх абавязацельствы ні ў якім разе не павінны застацца ўрачыстай дэкларацыяй. Баявая задача— пераўтварыць гэтыя абавязацельствы ў жывую канкрэтную справу.

Каапэрацыйныя арганізацыі ўсіх іншых раёнаў БССР павінны падхапіць выклік Рагачоўшчыны і ўзяцца за работу.

Апарат Рагачоўскага спажыўсаюзу мабілізаваны на правядзеньне конкурсу

РАГАЧОЎ. (Наш спэцкор.). Бюро Рагачоўскага райкому КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове ўхваліла правядзеньне конкурсу на лепшае сельскае спажывецкае таварыства па абслугоўваньні весьнавой пасеўнай кампаніі. Бюро прапанавала райспажыўсаюзу, на аснове абавязацельстваў, прынятых раённым зьлётам ударнікаў каапэрацыі і каапактыву, бесадкладна наладзіць штодзённае апэратыўнае кіраўніцтва ходам конкурсу. Увесь склад фракцыі райспажыўсаюзу, паводле пастановы бюро, мабілізован на правядзеньне конкурсу і арганізацыйна абслугоўваньня пасеўнай. Забаронены ўсякія мабілізацыі адказных работнікаў райспажыўсаюзу і сельспажыўтаварыстваў на розныя іншыя работы.

Арбітру ўнутрыраённага сацспаборніцтва, рэдакцыі газэты «Камунар» прапанавана сыстэматычна асьвятляць пытаньні абслугоўваньня каапэрацыяй пасеўнай кампаніі.

Усім ячэйкам прапанавана ўзяць пад сваю асабістую кантроль і кіраўніцтва ход конкурсу на лепшае сельскае спажывецкае таварыства, пэрыядычна заслухоўваць даклады сельспажыўтаварыстваў, ставіць інфармацыю аб ходзе конкурсу на сходах і зьлётах пайшчыкаў і г. д.

На ўпаўнаважаных райкому і РВК, якія мабілізаваны для правядзеньня пасеўнай кампаніі, ускладзена адказнасьць за работу на перабудове вясковай каапэрацыі.

Райкому камсамолу прапанавана ўключыцца ў правядзеньне конкурсу і мабілізаваць групу камсамольцаў на дапамогу сельспажыўтаварыствам.

Бюро райкому пастанавіла кожную дэкаду заслухоўваць даклады сельспажыўтаварыстваў пра ход конкурсу і абслугоўваньне пасеўнай кампаніі.

М. Ч.

Уключыліся ў конкурс

МАГІЛЕЎ. Дашкаўскае сельскае спажывецкае таварыства ўключылася ў конкурс, абвешчаны «Зьвяздой», Белкаапсаюзам і прафсаюзам работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю.

Абмеркаваўшы плян конкурсу, праўленьне абавязалася арганізаваць два дадатковыя ларкі ў калгасах сельсавету, вылучыць лепшы асартымэнт тавараў для ўдарных калгасаў, якія ідуць уперадзе па сяўбе. Калгас «Відны шлях», які зьяўляецца перадавым калгасам, атрымлівае 40 проц. усіх дэфіцытных тавараў. У поснай праме арганізаваны пацёны ўдарнікаў сяўбы.

Выгучан асобны фонд тавараў для прэміяваньня лепшых калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Арганізаваны два перасоўныя ларкі, якія на ўвесь час сяўбы будуць рэвізіраваць па калёх.

Старшыні правяраюць калгасаў абавязаліся, паводле дагавору, аказваць сельспажыўтаварыствы на закупку тавараў для лепшых калгасьнікаў.

Н. Н.

СПЛАЎНЫЯ РАБОТЫ РАЗГОРТВАЮЦЦА ВЕЛЬМІ ПАВОЛЬНА

МАЗЫРСКАЯ СПЛАЎКАНТОРА НА РЭКАХ НЯ МАЕ НІ АДНАГО БЕРВЯНА

Паскорыць дастаўку лесу на магістралі

Ня гледзячы на тое, што сплаў пачаўся ўжо каля месяца назад, тэмпы яго вельмі нізкія. Яны не забясьпечваюць поўнага і своечасовага выкананьня сплаўной праграмы. **Асабліва марудна дастаўляецца лес з глыбінных пунктаў па выплавачных рэчках на магістральныя рэкі.** Мала таго, што на вазу—усяго 260.000 кбм., драўніна вельмі доўга знаходзіцца ў дарозе. Як паказваюць весткі, са спушчаных 260.000 кбм. на 10 красавіка прыбыла на магістраль толькі 41.000.

Марудней за ўсіх працуе **Мазырская** сплаўканторка. Яна на 10 красавіка спусьціла на ваду толькі 27.147 кбм. драўніны. І характэрна, што ўвесь пушчаны ў сплаў лес знаходзіцца яшчэ ў дарозе. Ні аднаго бервяна як на фармовачныя пункты магістральных рэк, так і на месца прызначэньня яшчэ не прыбыло. Адстае і **Віцебская** сплаўканторка. Яна на 10 красавіка пусьціла ў сплаў 63.238 кбм., а прыбыло на фармовачныя пункты толькі 4,5 тыс., на месца-ж прызначэньня таксама ні аднаго бервяна не прыбыло.

Адной з прычын такіх нізкіх тэмпаў сплаўных работ зьяўляецца невыстарчальная забясьпечанасьць сплаву рабочай сілы. Патрэбна 24.000 чалавек, а ёсьць 13.000.

Рашаючую ролю ў павышэньні тэмпаў сплаву адыгрывае арганізацыя сплаўных работ. Між тым, кіраўнікі многіх сплаўных вучасткаў зусім не займаюцца гэтым пытаньнем, ня ведаюць фактычнага становішча з падвоскай, прыёмкай, сартоўкай, вязкай і спускам на ваду лесаматар'ялаў і дроў.

Характэрным прыкладам у гэтых адносінах зьяўляецца незадавальняючы ход сплаву ў **Верхня-Сожскім і Верхня-Бясядзкім** вучастках гомельскай сплаўканторы, якія фігуруюць у падрукаванай сёньня карэспанденцыі з Гомелю. Там у сплаўны апарат пралезьлі клясава-чужыя элемэнты. Карыстаючыся правамі савецкіх служачых, яны вядуць там шкодную работу, тармозячы ўсякімі спосабамі тэмпы сплаву.

Трэба сплаўляць, а лес ня прынят і неадсартаван

ВІЦЕБСК. **Віцебская** сплаўканторка павінна сплавіць у гэтым годзе 520 тыс. кбм лесаматар'ялаў. Але да сплаву не падрыхтавалася. Кіраўніцтва сплаўканторы не забясьпечвае посьпехаў работы. Дамо слова фактам. **На 10 красавіка леспрамгасамі падвезена да прыстаняй 409 тыс. кбм. лесаматар'ялаў, што складае 78,7 проц. пляну.** Прыпята-ж сплаўканторай 273.600 кбм, або 66,7 проц. з ліку падвезеных. Асабліва марудна ідзе прыёмка па **Полацкім вучастку,** дзе прынята ўсяго толькі 69.500 кбм, замест 133.300 па пляну і **па Сураскім вучастку,** дзе замест 66 тыс. кбм. пляновых, прынята 27.300. Усё гэта вынік таго, што работнікі сплаву адпачываюць на лаўрах і пачалі прыёмку толькі тады, калі адкрылася навігацыя.

Сучасныя тэмпы сплаву ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьне пляну ў тэрмін, бо на 10 красавіка пушчана ў сплаў бутаўнічых матар'ялаў і дроў 69.300 кбм., або 13,3 проц. гадавога заданьня. Апошняе дакада дала ўсяго прыросту толькі на 48.300 кубаметраў. **Штодзённа сплаўляецца ня больш 1-го проц. заданьня. Такія тэмпы работы змогуць забясьпечыць выкананьне пляну на 1 мая толькі на 35 проц., у той час, як па пляну трэба сплавіць 50 проц.**

Патрэбнасьць рабочай сілы сплаўканторай складзена на-вока. Запраектавана 2.500 чал. у той час, як патрэбна 2.840. Зараз пачалася ўдарная работа па сплаву, а рабочых нехапае. Вярбоўка рабочай сілы правалена. Завербавана толькі 2.410 чал. Конскай цягавай сілы таксама нехапае. На закупкі коняй адпушчаны сродкі, але яны і дагэтуль ліквідуе нескарыстаныя.

Горш ідзе вязка плытоў. На 10 красавіка зьвязана буксірных матар'ялаў 26.200 кбм. і 4 тыс. кбм. дроў. Адчуваецца значны недахват спасьцяй. З патрэбнай колькасьці паводле пляну 45 тон, ёсьць толькі 27 тон, але і тыя вельмі дрэннай якасьці. Пасобныя вучасткі паведамляюць, што спасьці гніюць, рвуцца, што выклікае аварыі. Сплаў экспартлесу спасьцямі зусім незабясьпечаны.

Яшчэ да гэтага часу не падрыхтаваны лодкі для караванічыкаў. Ёсьць толькі 112 замест—150 па пляну. У Лучаскім вучастку няма ні адной лодкі. Маторныя лодкі не адрамантаваны, з 7 штук адрамантаваны толькі дзьве, у той час, як **Лепельскі і Полацкі** вучасткі адчуваюць у іх вялікую патрэбу.

Снабжэньне рабочых і грамадзкае харчаваньне не палепшана. Арганізацыя сталовых і чайных на вучастках працуюць з перабоямі з-за нястачы прадуктаў. Адпушчаныя крэдыты на фінансаваньне сплаўных работ затрымліваюцца ў леспрамгасах. Так, на станцыі **Лёзна** два тыдні лежалі прадукты, прызначаныя **Лучаскаму** сплаўному вучастку, з прычыны таго, што вучастак ня мог сродкаў іх выдаткаваць. Нават зараз сплаўныя вучасткі ў **Полацку, Лёзьне, Лепелі** ня маюць патрэбных сродкаў на выкуп прызначаных ім прадуктаў.

Прафсаюзная работа на сплаўных вучастках зусім заняпала. Былы старшыня рэвізіённага камітэту, паверанны старшыні мясцовага сплаўнога канторы тав. **Прохараў** заявіў, што прафработай на сплаўных вучастках павінен кіраваць райком саюзу. Сплаўканторка спасылаецца на райком, райком на канторку, а прафсаюзная і культмасавая работа на вучастках і да гэтуль не разгорнута.

Валенцінаў, Зарубежны.

Вярбоўкай плытагонаў не займаюцца

Гомальская сплаўная канторка зьяўляецца адной з буйнейшых у БССР. Яна складаецца з 7 сплаўных вучасткаў. Праграма работы канторы—сплавіць 705 тыс. кбм. лесу. Здавалася-б, што кіруючыя арганізацыі і сплаўканторы павінны былі ўлажыць усё гэта і ўзяцца па-бальшэвіцку за падрыхтоўку і правядзеньне сплаву. Але на справе гэтага няма. **Канторка працуе з рук вон дрэнна. З-за адсутнасьці жывёлы, апэратыўнага кіраўніцтва работай, сплаў канторка да навігацыі не падрыхтавалася. План вывазкі па будаўнічых лесаматар'ялах выкананы усяго толькі на 55,2 проц., а па дровах — на 40 проц.**

З-за марудненьня вясновай ганебна затрымалася і вязка плытоў. Дагэтуль зьвязана ўсяго 40 тыс. кбм. На некаторых вучастках лес вязкацца перыёдычна з-за адсутнасьці прыёмнічыкаў. Вязка плытоў затрымліваецца яшчэ і таму, што нехапае гузбы і іншых матар'ялаў.

Ёсьць пагроза зістаноўкі плытоў на падёмных прыстанях. Такая пагроза ідзе на вучастках — **Случ, Мільча, Касьянаўка, Чачэрск, Верхняя Бесядзь і Прапойск.** Прапойскі вучастак сплавіў дзелавой драўніны на магістралі ўсяго 30 проц. Дырэктар сплаўканторы тав. **Вячорка** не пізнаёміцца ходам сплаву і работай не кіруе. За ўвесь час ён ні разу не выязджаў на сплаўныя вучасткі, каб азнаёміцца з годам работы і даць адпаведныя ўказаньні.

На Верхня-Сожскім вучастку, прыкладна, валяцца 5 тыс. кбм. драўніны, якая да гэтага часу не зьвязана і ня пушчана ў сплаў. Загадчык вучастку тав. **Кулікаў** не прыняў ніякіх мер, каб хутчэй зьвязаць і сплавіць гэты лес.

Апараты рэнту сплаўвучасткаў засмечаны клясова-варожымі элемэнтамі. Дамо слова фактам. Навесьніком загадчыка **Верхня-Бесядзкага** вучастку працуе былы леспрамгасаслужыц—**Хейфец,** а прыёмшчыкам лесу—**Шышчэны** з апарату ў 1933 годзе нейкі **Пасікаў.**

Дрэнна стаіць справа і з рабочай сілай. Для сплаву патрэбна 5.515 рабочых, а ў наяўнасьці іх ёсьць толькі 2 тысячы. Вярбоўкай па сутнасьці ніхто не займаецца.

Грамадзкае харчаваньне не палепшана. Якасьць абедаў зусім нізкая. Прадукты, якія вылучаны для снабжэньня рабочых плытагонаў, доўгі час ляжаць на складах і не выкупляюцца, што адбіваецца на работах сталовых. Намесьнік дырэктара па рабочым забясьпячэньні тав. **Сом** не пазнаёміўся разгарнуць рабочую па сумасгатоўках.

Партыйная і прафсаюзная арганізацыі сплаўканторы не разгарнулі культмасавай і палітвыхаваўчай работы сярод рабочых плытагонаў. Гэты важнейшы вучастак і да гэтага часу застаецца самым вузкім месцам.

Палярзкі.

„ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ"!

(Ленін аб маёўках)

На міжнародным кангрэсе 1889 году было пастаноўлена дзень 1-га мая зрабіць сьвятам міжнароднай салідарнасьці рабочых і работніц усіх краін.

Першая маёўка ў нас сьвяткавалася ў 1891 годзе. У Піцеры ў ёй прымала ўдзел менш 300 рабочых. Ня было тады яшчэ ў рускіх рабочых сваёй арганізацыі, сваёй партыі. Рабочы рух у Расіі толькі пачынаўся.

Прайшло пяць год. У Піцеры арганізаваўся ўжо «Саюз барацьбы за вызваленьне рабочай клясы», які пачаў кіраваць рабочымі ўсім, пачаў выпускаць лістоўкі. У Піцеры разгарэўся забастоўны рух. Ленін сядзеў у гэты час у турме. У турме напісаў ён лістоўку «Рабочае сьвята 1 мая». Надрукавана яна была ў 2 тыс. экземпляраў і распаўсюджана на 40 фабрыках і заводах. Яна адыграла вялікую ролю, аб'ядала піцерскіх рабочых і паказала ім правесьці летняю забастоўку тэкстыльшчыкаў Піцеру, у якой прымала ўжо ўдзел 30 тыс. рабочых. Шчо пісаў у гэтай першай майскай лістоўцы Ільіч?

Расказаўшы аб барацьбе піцерскіх рабочых і рабочых іншых гарадоў, Ільіч пісаў: «Нара і нам, рускім рабочым, разгарнуць ланцугі, якімі абмотаці нас капіталісты і ўрад, каб трымаць у прыгнечаньні, пара далучыцца нам да барацьбы нашых братоў, рабочых іншых дзяржаў, стаць з імі пад агульны сьцяг, на якім напісана: рабочыя ўсіх краін, злучайцеся!». Гаворачы далей аб барацьбе рабочых Англіі, Францыі, Германіі і іншых краін, Ленін пісаў, што «яны ўпартай барацьбой і цяжкімі ахвярамі заваявалі сабе права разам абгаворваць сваю рабочую справу. Пажадаем-ка нашым братом у іншых краінах, каб барацьба хутчэй прывяла іх да жаданай перамогі, да таго часу, калі ня будзе ні паноў, ні рабоў, ні рабочых, ні капіталістаў, а ўсе будуць аднолькава працаваць і аднолькава разумна насалоджацца жыцьцём. Таварышы, калі мы будзем дружна і аднадушна злучацца, недалёкі той час, калі і мы, самкнуўшы ў стройныя рады свае сілы, зможам адкрыта далучыцца да гэтай агульнай барацьбы рабочых усіх краін, бяз розьніцы веры і племя, супроць капіталістаў усяго сьвету» (т. 1, стар. 498). Гэта было напісана ў 1896 годзе.

У 1904 годзе Ленін піша лістоўку «Першага мая». Яна вельмі прыгожа і горача напісана. «Кліч «Далоў самаўладзтва» пранёсься па ўсёй Расіі. Усё часьцей і часьцей паўтараецца гэты кліч на вуліцах, на шматтысячных сходах рабочых» — пісаў там Ленін. «Летам мінулага году падняліся дзесяткі тысяч на ўсім поўдні Расіі, пачаліся на барацьбу за лепшае жыцьцё, за свабоду ад паліцэйскага ярма. Буржуазія і ўрад кідрыжэлі перад прошчай рабочай арміі, якая адным упарам спынила ўсю прамысловасьць вялізарных гарадоў. Дзесяткі змагароў за рабочую справу палі пад кулямі царскага войска, пасланага супроць унутранага ворага... Няма такой сілы на зямлі, што схіліла-б мільёны рабочых, якія становяцца ўсё больш сьвядомымі, усё больш аб'яднаньмі і арганізаванымі. Кожнае пражэньне рабочых узьнімае новыя рады змагароў, прымушае больш шырокія масы працаўцца да новага жыцьця ці рыхтавацца да новай барацьбы».

У гэты час царскі ўрад ушчаў вайну з Японіяй. І Ленін пісаў у майскай лістоўцы 1904 году: «Злачынна пачатая самаўладзтвам вайна з Японіяй тольні паскорыць час яго пагібелі. Яна адкрые вочы самым несьвядомым рабочым на супрасьць сучаснага дзяржаўнага ладу... Пратэставаць супроць гэтай злачыннай і разбуральчай вайны павінны ўсе сьвядомыя пралетары Расіі. Яны павінны ў дзень 1-га мая — у дзень міжнароднага сьвята рабочай клясы — паказаць, што пралетарыят не прымае нацыянальнай варожасьці, што рускія і японскія рабочыя, вымушаныя сваімі ўраднямі змагацца ў варожых радах, уміраюць сябе членамі адной клясы, зьвязанымі брацкай салідарнасьцю» (т. VI, стар. 337).

Рэвалюцыя 1905 году ня зьвесла самаўладзтва, але дала рабочым вялікарны арганізацыйны вопыт, за тады росьцілі пралетарыят глыбока прадумаў перажытае. Ленскія падзеі 4-га красавіка (па новым стылі 17 красавіка) 1912 году паказалі, што сярод рабочых жыве працыцыя рэвалюцыйнай масавай стачкі. Забастоўкі, выкліканыя гэтымі падзеямі, ахапілі 300 тыс. рабочых, майскія — каля 400 тыс., адначасова з гэтым узьнялася хваля і эканамічных стачак. Апісываючы майскія забастоўкі 1912 году ў артыкуле «Рэвалюцыйны пад'ём», Ленін пісаў: «Руская рэвалюцыя ўзарушыцца разьвіла ў шырокіх разьмерах гэты пралетарскі мэтад агітацыі, узварушэньня, згуртаваньня і ўцягненьня ў барацьбу мас» (т. XV, стар. 536).

У 1912 годзе перад масы быў арыш товараў ЦК, але рабочыя аб'ядналіся, выпусьцілі лістоўкі з лёзунгамі партыі: «дэмакратычная рэспубліка, 8-гадзінны рабочы дзень, канфіскацыя зямлі памешчыцкай зямлі», з заклікамі: «Далоў царскі ўрад! Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка! Няхай жыве сацыялізм!» Усе рабочыя выступалі адзіным, агульным фронтам, з адзінымі і тымі-ж лёзунгамі, рыхтуючыся да адпаведнага напору самаўладзтву.

Маёўка 1913 году прайшла з такімжа ўзьнёсам.

Імпэрыялістычная вайна, пачатая ў 1914 годзе, затрымала хвалю пралетарскай рэвалюцыі, якая падымалася. Вайна ўскрыла апартуністам другога Інтэрнацыяналу, які прывёў да аслабленьня міжнароднай салідарнасьці пралетарыяту ўсіх краін. Рабочыя масы далі буржуазіі ўцягнуць сябе ў грабежніцкую здачынную вайну, легшую ўсім сваім цяжарам на народныя масы.

Тое, аб чым пісаў Ленін яшчэ ў 1904 годзе, што «злачынна пачатая самаўладзтвам вайна паскорыць час яго пагібелі», — адбылося ў 1917 годзе.

1 мая 1917 году, скінуўшы самаўладзтва, народ сьвяткаваў свае перамогу. Ленін з пачуцьцём глыбокага хваляваньня выступаў на гэтай маёўцы з трыбуны ЦК у Петраградзе.

У кастрычніку 1917 году расійскі пралетарыят, зварачаючыся да пралетарыяту ўсіх краін з заклікам скончыць вайну, высока падняў сьцяг брацкай салідарнасьці працоўных усіх краін і высока трымае яго ўвесь час.

1-га мая 1919 году Ленін выступаў на Красным плошчы ў Маскве. Ён гаварыў: «У мінулым годзе 1 мая мы былі пад пагрозай гэрманскага імпэрыялізму. Цяпер ён зломлен і зьнішчан. Зьмяцілася карціна сьвяткаваньня пралетарскага дня ня толькі ў нас. Ва ўсіх краінах рабочыя сталі на шлях барацьбы з імпэрыялізмам. Вызваленая рабочая клясе пераможна стрэліла свой дзень, свабодна і адкрыта ня толькі ў Савецкай Расіі, але і ў Савецкай Венгрыі і ў Савецкай Баварыі. Сёньня разам з тым можна з упэўненасьцю сказаць, што ня толькі ў Чырвонай Маскве, у Чырвоным Петраградзе і ў Будапэшце, але ва ўсіх буйных пролетарскіх цэнтрах рабочых, выпусьцілі не для прагулкі, а для дэманстрацыі сваіх сіл, гаворыць аб значнасьці савецкай улады і блізкай перамозе пралетарыяту» (т. XXIV, стар. 268).

Перамога сусьветнага пралетарыяту яшчэ ня прыйшла, у Германіі шалее фашызм, ідуць яўрэйскія пагромы, чорнасоценцы, захапіўшы ўладу, ня спыняюцца ні перад чым, і кожным сваім крокам ускрываюць сваю сапраўдную сутнасьць, паказваюць, якія блікітныя былі ўсе іх абяцаньні. Эўропа хвалюецца, падымае ўсюды галаву старая шавіністычная, па Германіі, пачынае разгарацца шавіністычны чад. На Ўсходзе Японія ўсё больш нічыльна наступае на Кітай, стараюцца разарваць яго на часткі, разарабіць.

Мы таксама перажывалі калісьці гады цёмнай рэакцыі, але ні мінучы не сустрэнулася наша партыя ў перамозе. І зараз — мы ведаем — пралетарыят пройдзе, даўшай чалавецтву вялікіх змагароў і мысьляцеляў, правадыроў сусьветнага пралетарыяту — Маркса і Энгельса, на глебзячы на ўсе пакаяньні гнічай буржуазіі і яе адкалаў, зьбяре сілы, згуртуецца і ў вялікай і магутнай сусьветнай арміі пойдзе на ліквідацыю капіталізму, зробіць свае дзеяньні, ператворыць ці ў ніцы, ці ў ніцы, ці ў ніцы,

УЗЬНІМАЮЧЫ ТЭМПЫ ПАЛЯВЫХ РАБОТ, УСЮ УВАГУ— НА ЯКАСЬЦЬ ВОРЫВА, БАРАНАВАНЬНЯ І СЯУБЫ!

ПРА КАНТРАКТАЦЫЮ ГАРОДНІНЫ ЎРАДЖАЮ 1933 г.

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

У адпаведнасьці з пастановай Савету Працы і Абароны за 11 сакавіка 1933 году «Пра кантрактацыю гародніны ўраджаю 1933 г.» («Известия ЦИК СССР і ВЦИК № 70 за 12 сакавіка 1933 г.) Эканамічны Савет БССР пастанаўляе.

1. Для забесьпячэньня выкананьня дакржаўнага пляну загатовак гародніны ўраджаю 1933 г. у колькасьці 50.500 тон захаваць у 1933 г. існуючую дагаворную (кантрактацыйную) сыстему загатовак гародніны.

Зацьвердзіць плян загатоўкі гародніны па кантрактацыі ў колькасьці 56 тыс. тон, давёўшы яго да калгасу і вёскі. Плян кантрактацыі гародніны разьмеркаваць па культурах і сэктарах наступным чынам:

Капуста—усяго	29,4 т. т.,	з іх у калгасах	23,4 т. т.,	у аднас. 6,0 т. т.
Цыбуля „	2,0 „	„ „ „	1,0 „	„ 1,0 „
Буракі „	8,0 „	„ „ „	8,0 „	„ — „
Морква „	3,5 „	„ „ „	3,5 „	„ — „
Бручка „	1,5 „	„ „ „	1,5 „	„ — „
Гуркі „	9,0 „	„ „ „	9,0 „	„ — „
Памідоры „	2,0 „	„ „ „	2,0 „	„ — „
РАЗАМ „	55,4 „	„ „ „	48,4 „	„ 7,0 „

Зацьвердзіць паданы ўпаўкамзагатовак праект разьмеркаваньня гародніны па раёнах. Абавязаць упаўкамзагатовак СНК па БССР і Народнае Камісарыят Земляробства на працягу 2 дзён разьмеркаваць раённы плян па сэктарох.

Абавязаць упаўнаважанага камітэту загатовак і загатоўчыя арганізацыі не пазьней 25 сакавіка 1933 году спусьціць раёнам па культурах і сэктарох раённыя пляны кантрактацыі.

3. Устанавіць, што ў кантрактацыйных дагаворах абавязацельствы пасеўшчыкаў па сяўбе гародніны вызначаюцца колькасьцю пастаўляемай гародніны, але разам з гэтым у дагаворы пасеўшчык абавязваецца засеяць гародніннай пэўную плошчу лепшай і добра апрацаванай зямлі, якая-б забясьпечыла здачу паказанай у дагаворы колькасьці гародніны.

Даручыць упаўнаважанаму камітэту загатовак СНК і Народнаму Камісарыяту Земляробства ўстанавіць гранічныя нормы здачы гародніны з гэктара в плошчы пасеву па раёнах.

4. Устанавіць, што кантрактацыя гародніны праводзіцца непасрэдна асноўнымі загатоўчыкамі (Белплодагародніна і Белкаапплодагародніна) і дапушчанымі да загатовак плодагародніны прадпрыемствамі ў калгасах, калгаснікаў і аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарках. У кулацкіх гаспадарках гародніна не кантрактуецца. Сельсаветы даюць ім цьвёрдыя заданьні па здачы гародніны.

Катэгарычна забараніць замену дагавораў кантрактацыі пратаколамі агульных сходаў грамадзян, падпісанымі лістамі і іншымі падобнымі ім дакумантамі, якімі не ўстанаўляецца прыняцьце кантрактацыйных абавязацельстваў самімі гаспадаркамі, на якіх гэтыя абавязацельствы пашыраюцца.

5. Дазволіць асноўным загатоўшчыкам у адведзеных ім раёнах прыцягнуць да правядзеньня кантрактацыі гародніны сваіх, важнейшых атрымальнікаў гародніны ў межах іх пляну.

6. Асноўныя загатоўшчыкі і атрымальнікі гародніны аказваюць калгасам вытворчую дапамогу (насеньнем, угнаеньнем, транспартам, працоўнай сілай і г. д.).

7. Для снабжэньня калгасаў, калгаснікаў і аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак, якія спраўна выконваюць свае абавязкі па кантрактацыі, адпускаюцца 515 тон хлеба, для правядзеньня авансавай кантрактацыі — 205 тыс. руб. і для стымуляваньня — прамтавараў на суму 960 тыс. руб.

Устанавіць, што хлеб, абансаваньне і прамтавары выдаюцца ў першую чаргу для снабжэньня здатчыкаў цыбулі ў таварна-цыбульных раёнах і здатчыкаў гародніны ў прызваджкіх зонах, сушыльных і красільна-засолачных пунктах.

Даручыць упаўнаважанаму камітэту загатовак СНК разьмеркаваць хлеб, прошкі і прамтавары па раёнах, сэктарох і дыфэрэнцыяваць выдачу хлеба па культурах і сэктарох.

8. Устанавіць наступныя тэрміны выдачы хлеба па дагаворах кантрактацыі: 15 проц. прадугледжаных кантрактацыйным дагаворам выдаюцца па скончэньні сяўбы, але не пазьней чэрвеня месяца, 15 проц. на скончэньні праполкі, але не пазьней першай паловы жніўня і 70 проц. пасьля фактычнай здачы прадукцыі па дагаворах кантрактацыі.

Грашовыя авансы выдаюцца ў два тэрміны: першы ў разьмеры 35 проц. на прадпасеўную падрыхтоўку пры падпісаньні дагавору і другі ў разьмеры 65 проц. на догляд пасеваў пасьля абмеру фактычнага пасеву ў II квартале.

Прамтавары для стымуляваньня здатчыкаў-кантрактантаў гародніны вазвяцца: 45 проц. у III-м квартале і 55 проц. у IV квартале. Даручыць упаўнаважанаму камітэту таварных фондаў заваймія прамтавары накіроўваць непасрэдна па склады загатоўляючых арганізацый (Белкаапсадгародніна і Белсадгародніна).

9. Абавязаць Белкаапсадгародніну і Белсадгародніну ўстанавіць сапраўдны кантроль і праверку выкананьня пасеўшчыкамі іх абавязацельстваў па засеве гародніны ў разьмерах, якія забясьпечваюць выкананьне дагавораў.

Абавязаць загатоўшчыкаў па скончэньні сяўбы гародніны зрабіць праверку фактычнага засеву, падаўшы ўпаўнаважанаму камітэту загатовак СНК не пазьней 10 ліпеня 1933 г. зводны матар'ял па БССР і па асобных раёнах.

10. Устанавіць, што з калгасаў, калгаснікаў і аднаасобных гаспадарак, якія ня выконваюць абавязацельстваў па дастаўцы гародніны ва ўстаноўленыя кантрактацыйнымі дагаворамі тэрміны, спаганяецца ў бясспрэчным парадку невыкананая частка абавязацельства натурай і апрача таго накладзецца прадугледжаная дагаворам.

11. Забараніць калгасам, калгаснікам і аднаасобным бядняцка-сераднякам гандаль гародніннай у выпадку невыкананьня імі кантрактацыйных абавязацельстваў па здачы (продажы) гародніны ва ўстаноўленыя дагаворамі тэрміны.

12. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і загатоўшчыкам не пазьней 1 красавіка 1933 г. распачаць кампанію кантрактацыі гародніны, давёўшы плян кантрактацыі да калгасу і вёскі, устанавіўшы канчатковы тэрмін скончэньня кантрактацыі — 15 мая 1933 г.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР БЭНЭК.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР КАНДЫБОВІЧ.
25 сакавіка 1933 г.

ПЛЯН ВЫКАНАН

КАЛГАС ІМЯ КАРЛА МАРКСА УЗОРНА ПРАВОДЗІЦЬ СЯЎБУ

КАМАРЫН, 17.

Пасаобныя калгасы ўзорна праводзяць сяўбу ранніх яравых культур. Першым у раёне пабудзіцьцо засеяў авёс калгас імя Карла Маркса. Пасеўны плян у 16 га аўса выкананы у гэтым калгасе ашчэ на 12 красавіка. Калгас імя Карла Маркса таксама скончыў сяўбу ячменю. Плян перавыкананы на 0,5 га. Зараз калгас разгортвае сяўбу пшаніцы. Сьледам за калгасам імя Карла Маркса скончыў сяўбу аўса і калгас «Савецкая Беларусь». Засеяна 14 га. Гэтае сяўба ячменю і пшаніцы. Калгас імя Чарнякова засеяў 40 гэктараў.

Брыгады гэтых калгасаў добра арганізавалі сваю работу. За кожнай брыгадай замацаваны пастаянныя вучасткі, інвентар і цягавая сіла.

Саўгасы абавязаны пакончыць з ганебным адставаньнем

Саўгасы БССР павінны засеяць да 25 красавіка 30.290 гэктараў аўса.

У мінулым годзе саўгасы запазнілі сяўбу амаль да ліпеня. Авёс, напрыклад, рад саўгасаў сеяў у чэрвені. Зразумела, што такое ігнараваньне агратэхнікі адбілася і на ўраджайнасьці.

Тэрміны сяўбы маюць рашаючае значэньне ў барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці. Аднак, практыка першых дзён палявых работ паказвае, што ўрокі мінулага году саўгасамі не ўлічаны. Большасьць саўгасаў злачыні на адцяжнае пачатак палявых работ. Ня толькі сяўба, але нават ворыва і баранаваньне ў большасьці гаспадарак не пачата.

Павопце вестак упаўнаркамсаўгасу і паасобных трустаў у саўгасах БССР узарана ад 400 да 500 гэктараў. Засеяна ня больш 15—20 гэктараў. Пра ілюструем фактамі.

У саўгасе «Сьляпянка» ёсьць поўная магчымасьць разгарнуць ворыва і баранаваньне. Між тым, да 18 красавіка коні ў полі зусім не працавалі. З трох трактараў на ворыве былі заняты два. 18 красавіка трактары працавалі ня больш паловы дня. 19-га красавіка трактары выехалі ў поле толькі а 9 гадзіне раніцы. Дырэктар саўгасу Кізель і старшы механік Фэргольц увесь час адцягваюць пачатак палявых работ.

У саўгасе Заречча, Смалявіцкага раёну, глеба лёгкая, можна разгарнуць ворыва. Ня гледзячы на гэта, дырэктар Чарнявускі і агранам Цімафеевіч ходзяць, паглядаюць на неба, а палявых работ не разгортваюць.

На Радыёпраме, за подпісам т. т. Сталіна і Молатава, аб разгортваньні палявых работ дырэктар Чарнявускі, ня чытаючы, напісаў рэзалюцыю: «Аграному Цімафеевічу для выкананьня».

17 красавіка 2 трактары выйшлі на работу пасьля 9 гадзін. Адзін трактар зусім не працаваў, бо трактарыст Дзямідчык прагінствываў ноч і ня выйшаў на работу.

Сакратар парт'ячэйкі Купіцкі замест таго, каб мабілізаваць рабочых калектыў на пасьпяховае правядзеньне сяўбы, паехаў у лес за дрывамі.

У саўгасе «Райцы», Талачынскага раёну, ёсьць 4 трактары і 90 рабочых коняй. Коні ў добрым целе. Ня гледзячы на поўную забясьпечанасьць цягавай сілай, саўгас ашчэ ня вывез на цалі 1.200 тон гною. І зараз коні гной ня возяць, а заняты на розных дапаможных работах. За 3 месяцы рабочым ня выплачана пэнсія. Дырэкцыя ня прымае ніякіх мер, каб ліквідаваць запазычанасьць. Грамадзкае харчаваньне зусім не наладжана. Рабочых з дня ў дзень корыць бручкай.

У саўгасе «Негарэлае» (Дзяржынскі раён) ніадна для праверкі падрыхтаванасьці гаспадаркі да палявых работ была арганізавана камісія ў складзе дырэктара Шчыкалава, сакратара парт'ячэйкі Снарскага і ўпаўнаважанага ЦК Каліды. Камісія напісала акт аб тым, што саўгас поўнасьцю падрыхтаван да сяўбы. Палявыя работы саўгас пачаў 10 красавіка. І вось у першы-ж дзень выявілася, што 2 сяляркі зусім не адрэмантаваны, 3 трактары адразу-ж выйшлі са строю. Дырэктар саўгасу і сакратар парт'ячэйкі, замест праверкі якасьці рамонту займаліся штампоўшчынай.

У радзе саўгасаў да арганізацыі трактарных брыгад і расстаноўкі рабочай сілы ў полі падышлі фармальна. Гэта адбіваецца зараз на якасьці ворыва. Напрыклад, у саўгасе «1 мая» (дырэктар Калінін, агранам Раро) на ворыве заняты 5 трактараў. Загоны за трактарыстамі не замацаваны. Трактары аруць адзін за другім. Як толькі стане адна машына, спыняюць работу і ўсе іншыя. Некаторыя трактарысты ў такіх выпадках прабуюць аб'ехаць першую машыну, у выніку чаго на палёх шмат апрохаў. Няма ўліку якасьці і колькасьці кожнага трактарыста. Узораная плошча дзеліцца паміж усімі трактарыстамі.

Вось першыя вынікі палявых работ у саўгасах БССР.

З.

Лубін—новая культура для пашыранньня кармовай базы. На здымку: лябаратарна цэнтральнай кантрольна-насьвенай станцыі БССР у Менску тав. ВАЛОВІЧ дасьледуе лубін.

ДЭЛЕГАТКА ЗЬЕЗДУ--АРГАНІЗАТАР УДАРНАЙ СЯЎБЫ

ВУШАЧЫ, 19.

Делегатка першага ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў ад калгасу «Чырвоная Полаччына» па-баявому арганізуе калгаснікаў на правядзеньне веснавой сяўбы.

Па ініцыятыве тав. Карэйша калгас «Чырвоная Полаччына» адным з першых у раёне разгарнуў палявыя работы.

Ворыва ў калгасе пачалося з 4-га красавіка. За 10 дзён калгас «Чырвоная Полаччына» ўзараў 233 га. Засеяна 16 га канюшыны і 1 га ільну. Па палі калгасу вывезена 2.600 вазоў угнаеньня. Зараз калгас разгортвае сяўбу аўса.

Першае месца як па колькасных, так і па якасных паказальніках займае брыгада тав. Шэўчанкі. Брыгада кожны дзень перавыконвае нормы выпрацоўкі.

Штодзенна ў брыгадах выпускаюцца насьценгазэты, у якіх паказваецца работа лепшых і адстаючых калгаснікаў. Вядзецца самы дакладны ўлік выпрацоўкі кожнага калгасніка. Брыгады сваячасова выходзяць на работу. За ўсе дні ворыва і сяўбы ня было ні аднаго прагулу і спазьненьня.

Калгаснікі с.-г. арцелі «Чырвоная Полаччына» ня толькі самі змагаюцца за максымальна кароткія тэрміны палявых работ. Яны выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва суседнія калгасы. Спаборніцтва разгортваецца на справе.

Сьледам за калгасам «Чырвоная Полаччына» калгас «Чырвоная зьмена» за 6 дзён узараў 81 гэктар — 70 проц. усяго яравога кліну. Калгас «Чырвоны араты» ўзараў 50 проц. яравога кліну і ўжо засеяў 7 га.

Адстае ў спаборніцтве з калгасам «Чырвоная Полаччына» калгас «Зьвязда», які ўзараў толькі 17 гэктараў. У гэтым калгасе за брыгадамі не замацаваны пастаянныя зямельныя вучасткі. Калгаснікі несваячасова выходзяць на работу. Есьць прагулы.

Калгаснікі с.-г. арцелі «Чырвоная Полаччына» ўзялі на буксір калгас «Зьвязда».

ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА СКОНЧАНА

ВУШАЧЫ, 19.

РАЕН ПЕРАВЫКАНАЎ ПЛЯН ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ, УСТАНОЎЛЕНЫ НКЗ БССР, НА 12 ГА. НА 15 КРАСАВІКА ЗАСЕЯНА 27 ГА ІЛЬНУ І 12 ГА ЗБОЖЖАВЫХ. ПЕРШЫМІ ПРЫСТУПІЛІ ДА ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ І ВЫКАНАЛІ УСТАНОЎЛЕНЫЯ ЗАДАНЬНІ КАЛГАСЫ, ЯКІЯ АБСЛУГОВАЮЦЦА РАЕННАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫЯЙ.

ПАЛІТАДДЗЕЛ ЗАБЯСЬПЕЧЫЎ ПЕРАЛОМ

ПОЛАЦАК, 19.

Да арганізацыі палітаддзелаў саўгас Баюны ня выязьдзіў з глыбокіх прарываў. Трактары былі не адрэмантаваны. На стайнях панавала абязьлічка. Коні даглядаліся дрэнна.

Палітаддзел з першых дзён сваёй арганізацыі разгарнуў баявую практычную работу. Рашуча ўмацавана працоўная дысцыпліна. Створаны пастаянныя палявыя брыгады. За кожнай брыгадай замацаваны зямельныя вучасткі, інвентар і цягавая сіла. Нормы выпрацоўкі даведзены да кожнай брыгады і паасобнага рабочага. Разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва сярод трактарыстаў. У кожнай брыгадзе выпускаецца насьценгазэта.

Палітаддзел праверыў спраўнасьць кожнага трактара. Трактарны парк прыведзен у баявую гатоўнасьць. Усе машыны поўнасьцю і добра адрэмантаваны.

Палітаддзел правёў сур'ёзную работу па ўмацаваньні партыйнай ячэйкі. Бюро парт'ячэйкі перавыбрана. Рад калгаснікаў, якія страцілі клясавую пільнасьць і перарадзіліся, выключаны з партыі.

ШЫРОКА РАЗГАРНУЦЬ ПАРТМАСАВУЮ РАБОТУ У КААПГАСАХ

Выкананьне вялізарных і адказьнейшых задач, пастаўленых перад прыгараднымі гаспадаркамі—стварэньне ўласнай харчовай базы і ўсямернае паляпшэньне рабочага снабжэньня, — немагчыма без разгортваньня партмасавай работы ў каапгасах. Асабліва востра стаіць гэта пытаньне зараз, у сувязі з разгортваньнем сяўбы.

Аднак, мы павінны прызнаць, што партыйна-масавая работа ў каапгасах стаіць на зусім нізкім узроўні, а па радзе гарадоў гэта зусім закінуты вучастак.

Возьмем ВІЦЕБСК і БАРЫСАЎ, дзе налічваецца 18 буйных каапгасаў.

У Віцебску практычна нічога ня робіцца для разгортваньня партыйна-масавай работы ў каапгасах. На нарадзе ў гаркоме (26 сакавіка) сакратары парткалектываў адкрыта заявілі: «мы гэтым пытаньнем амаль што не займаліся». І гарком КП(б)Б, апрача прыняцьця пастаноў, нічога практычнага не зрабіў. Работнікі ГК ні разу не праверылі, як парткалектывы і ячэйкі выконваюць дырэктывы ЦК і ГК, як яны працуюць. І гэта ня гледзячы на тое, што большасьць каапгасаў Віцебшчыны бязьдзейнічае і праваліла падрыхтоўку да сяўбы.

З 14 прыгарадных гаспадарак, парт'ячэйкі ёсьць у дзьвёх («ТЫРАСПОЛЬ», «НОВЫ ШЛЯХ»), а партгрупы — у трох («ТУЛАВА», ІМЯ МОЛАТАВА, «ПАРЫСКАЯ КАМУНА»). З 60 камуністаў, што лічацца ў каапгасах, усяго 8—10 чал. працуюць непасрэдна на вытворчасьці. Зразумела, што гэта вельмі адбіваецца на становішчы нават гэтых дзьвёх ячэек.

Парт'ячэйка гаспадаркі «Новы шлях» (фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі») налічвае 5 членаў і 6 кандыдатаў КП(б)Б. Камуністы не прымацаваны да поўных вучасткаў гаспадаркі. Апошні партсход ячэйкі правялі 26 лютага г. г. Масава-палітычная работа сярод рабочых амаль што не праводзіцца, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута. Гаспадарчая работа (арганізацыя працы, улік, якасьць, расстаноўка і максымальнае выкарыстаньне рабочай сілы і г. д.) зусім дрэнная. Ведаючы аб усім гэтым, парткалектыў фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» чамусьці за апошнія 3—4 месяцы ні аднаго разу ня ставіў справаздачы аб рабоце ячэйкі і неогул ніякіх дырэктыў ячэйцы не дае.

Партгрупа гаспадаркі «Парыская камуна» (ЗВК) налічвае 8 членаў партыі: дырэктар, два загадчыкі вучасткаў, кладаўшчык, начальнік аховы, старшыня рабачкому, загадчык гаспадаркі і брыгадзір. Ні адзін з камуністаў не прымацаван да вытворчых вучасткаў: скотнага двара, парнікоў, трактарнага парку, стайні, сьвінарніка, сталовай, трусатніка, да палявых брыгад і г. д. І праўда, што партгрупа, якая зьбіралася ўсяго два разы, вяла «агульныя» разважаньні.

Ніякай палітвучобы сярод камуністаў, камсамольцаў і рабочых не вядзецца. Кіраўнік партгрупы тав. ЯКУЦЮНАК заяўляе: «Палітвучоба толькі ў стадыі арганізацыі, а масава-палітычная работа сярод рабочых гаспадаркі абмяжоўваецца правядзеньнем калі-небудзь сходаў рабочых». Рабочыя, якіх налічваецца 137, у пачатку падрыхтоўкі да сяўбы прынялі выклік Смаленскага каапгасу і падпісалі сацыялістычны дагавор, але ў сапраўднасьці ніякага спаборніцтва і ўдарніцтва у каапгасе няма, ні адзін пункт падпісанага сацдагавору ня выканан.

Дрэнная пастаноўка партыйнай работы, адсутнасьць кіраўніцтва з боку парт'ячэйкі ЗВК, якой падпарадкавана гэта партгрупа, прывялі да таго, што гаспадарка даведзена да катастрафічнага становішча.

Калі мы ў Віцебску знайшлі хоць нейкі-небудзь пастановы аб партмасавай рабоце ў каапгасах, дык у БАРЫСАВЕ і гэтага няма. Тут няма ніякіх пастаноў, ніякіх дырэктыў і ніякай практычнай работы.

Парт'ячэйка каапгасу «БЯРЭЗІНА», якая налічвае 8 камуністаў, пакуль што ні аднаго не прымацавала да якога-небудзь вытворчага вучастку. У ячэйцы няма ні адной практычнай пастановы аб становішчы гаспадаркі. Ячэйка ні разу не правярала работы камуністаў на вытворчасьці. Гутарылі «наопуп», запісвалі «ў цэлым», але каго і калі, за што — невядома. Рэгулярнага партвучоба адсутнічае, насьценгазэта не выпускаецца, сацспаборніцтва і ўдарніцтва праходзіць фармальна, бяз увязкі з канкрэтнымі вытворчымі задачамі, у прыватнасьці, з падрыхтоўкай і правядзеньнем сяўбы.

Такое-ж прыкладна становішча з партмасавай работай і ў ячэйцы СТАРА-БАРЫСАЎСКАЙ ФЭРМЫ, дзе хаця камуністы расстаўлены па рашаючых вучастках, але ячэйка за ўвесь час падрыхтоўкі да сяўбы ні аднаго разу не заслухоўвала, як таварышы працуюць, якія дадатныя або адмоўныя бакі ў іх рабоце, у якой дапамозе яны маюць патрэбу, каб поўнасьцю справіцца з даручанай работай. Тут таксама дрэнна з палітвучобай камуністаў, камсамольцаў і з масава-палітычнай работай сярод рабочых. Напрыклад, матар'ялы ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў і прамова на гэтым зьезьдзе тав. СТАЛІНА ніхім на фэрме не прапрацаваны. Тэму невыпадкова, што вываэка ўгнаеньня ганебна правальваецца, цягавая сіла да сяўбы не падрыхтавана, з 88 рабочых коняй выбыла са строю 33.

Характэрна, між іншым, што прыяжджаючыя на прыгарадныя гаспадаркі розныя камісіі, у тым ліку ад райкому і парткалектыву, цікавяцца ўсім, толькі не партмасавай работай.

Можна прывесьці шмат рад анапэгічных фактаў дрэннай пастаноўкі партмасавай работы ў каапгасах і па ГОМЕЛІ, і па МАГІЛЕВУ, і па БАБРУЙСКУ і г. д. (аб гэтым пісалася ў «Зьвязьдзе»), але і гэтага даволі, каб упэўніцца ў недзвычай дрэннай пастаноўцы партмасавай работы ў прыгарадных гаспадарках.

За апошні час у каапгасы для работы перакінута шмат камуністаў і беспартыйных рабочых-ударнікаў з прадпрыемстваў гораду. Гэта дзвінна адыграць вялікую ролю ў стварэньні ў кожным каапгасе сваёй моцнай парт'ячэйкі, здольнай на справе змагацца за бальшавіцкі каапгас, за паляпшэньне рабочага снабжэньня. Вялізарную і рашаючую ролю ў палітычна-гаспадарчым ўмацаваньні каапгасаў адыграюць пасылаемыя зараз, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, у самыя буйныя каапгасы БССР палітруки, падбору якіх ГК і РК КП(б)Б павінны аддаць самую сур'ёзную ўвагу, даўшы для гэтай работы лепшых бальшавікоў.

Умацаваньне каапгасаў палітрукамі ня зьнімае адказнасьці з парткалектываў прадпрыемстваў, якія ў першую чаргу павінны сур'ёзна зняцца арганізацыяй і ўмацаваньнем парт'ячэек каапгасаў і разгортваньнем там партмасавай работы. Заводаціраўніцтвы, фабзаўкомы, ЗРК павінны рэгулярна дапамогу прыгарадным гаспадаркам, як важнейшае зьвяно ў барацьбе за далейшае паляпшэньне рабочага снабжэньня. Трэба раз на заўсёды ўсьвядоміць тую простую ісьціну, што посьпех веснавой сяўбы і ператкаваньня каапгасаў у сапраўды бальшавіцкія залежыць ад якасьці кіраўніцтва і правільнай пастаноўкі партмасавай работы.

Усямерна ўмацаваць ячэйку і партгрупу каапгасу, правільна расставіць партыйна-камсамольскія сілы на рашаючых вучастках вытворчасьці, каб ахапіць сваім партыйным уплывам і кіраўніцтвам кожнага рабочага, развіць партыйна-масавую і палітычна - растуманчальную работу, выгнаць з каапгасаў клясава-чужых людзей, лодыраў, пятуноў, рэзчоў, — вось што зараз патрэбна, каб па-сапраўднаму правесьці першую бальшавіцкую вясну другой пяцігодкі і зрабіць каапгасы бальшавіцкімі.

Як. ВАЙНШТЭЙН.

А. СУЧКОВА

НАРАД № 1

Нарад № 1 ляжаў перад брыгадзірам Вашкевічам новеньким кавалкам паперы, выклікаючы зьбянтэжанасьць і злость.

— От, яшчэ адна навіна...

Сапраўды, гэта было навіной.

Раней працілі калгаснікі ўлічвалі па асобных вяткох, якія запаўнялі рахункавод. Калгаснік працаваў шалоны год і толькі ў канцы—пры разьмеркаваньні ўрадкаю—яму паведамлялі, колькі ён выпрацаваў.

Цяпер сыстема ўліку ў корані змянілася. Брыгадзіру давалася нарад з дакладным вытворчым заданьнем—аб'ём, тэрміны выкананьня, цьвёрдыя нормы выпрацоўкі з расцэнкамі ў працадзёх.

Брыгадзір паскрэб патылічку і ўздыхнуў.

— Не палохайся, братка. Справа не цяжкая,—супакойваў яго старшыня калгасу.—Толькі прывыкнуць трэба.

— Да чаго?

— Да працоўнай дысцыпліны прывыкнуць.

Зноў паскрэб брыгадзір патылічку і вінавата ўсьміхнуўся.

... У нарадзе № 1 даваліся першыя элементы заданьні новаму брыгадзіру калгаснай брыгады. Брыгада павінна была ўзараць на вучастку Конскіх могілак 18 га цалінны, забараніваць на Лопыльнскім полі 12 гэктараў і ўзараць з гэтага-ж поля 50 вазоў каменьняў.

Норма кожнага аратага ў дзень—0,60 га. баранавальшчыка—4 га (на трохзьвенку ў два сьляды), норма вазчыка каменьняў — 10 вазоў.

***

Ля Конскіх могілак—жвір-зямля. Сьнег сыйдзе—адразу сухо. Таму, мабыць, і выбраў старшыня калгасу гэты кавалак цалины для першага ворыва.

Лёгкая зямля, мяккая. Плуг сам плыве за конём, як човень па рэчцы.

Цяжка стрымаць Мікоце Вашкевічу сваю «Галку»: ляціць, як тая страла. Ледзь плуг у руках утрымаеш.

Лёгка і роўна ўзьнімае землю вострыя лемяхі Мікоцінага плуга. Кладзецца ўзьвятая цалина чорнымі, нарухомымі палосамі.

Толькі... пераблыталіся гэтыя палосы з іншымі суседнімі і не разьбярэш добра: дзе мяжа Мікоцінай работы, дзе мяжа суседніх аратых.

З першых-жа хвілін як выйшлі на ворыва, заўважыў брыгадзір Вашкевіч, што груба аратых у 11 чалавек ня правільна падабрана і расстаўлена. Расхінуліся аратыя па ўсім полі: адны далёка, другія ў кучу зьбіліся. Ходзяць гуськом адзін за адным, цяжка прасачыць за якасьцю ворыва.

А жывы араты, гэта ня проста лічбінка ў нарадзе.

Вось Аніськевіч Пётра ля ўзгорку. Здалёк бачыць брыгадзір—дронны араты Пётра. Ходзіць, як сьляпы, нешк у бок пазірае.

— Зьмяніць трэба Аніськевіча Пётру,—думае брыгадзір.—А ў брыгаду ўзяць Клімантовіча з фэрмы. От-жа выйшла такая справа. Клімантовіч—спэц па цалявоцтве, а яго ў жывёлагадоўчую фэрму прытыгулі.

Брыкі і шум прыпыняюць думкі брыгадзіра.

Здалёк, на суседняй баразьне, махае рукамі Якубоўскі,—крычыць нешта, указваючы на плуг і сваіх коняй.

— У чым справа?

— Не, ты мае сказы, брыгадзір,—злосна крычыць Якубоўскі,—чаму далі мне плуг горшы за ўсіх?

— Што такое з тваім плугам?

— Іржавы.

— Чаму не даглядзеў?

— А вось давай пачынаемся,—хітра прыпыпчвае вочы Якубоўскі. — Давай памяняемся...

— Навошта мяняцца,—спакойна адказвае брыгадзір.—Плугі-ж прыпасаваны.

— А чаму мне горшы за ўсіх далі?

— Яні-ж ён горшы? Пачысьціць толькі было трэба. Бач, як Міша Сімановіч...

У Сімановіча, як і ў іншых аратых, налыпіліся на лямех зямельныя камякі. Ён чысьціць плуг старанна і маўчаліва. Нават вінаватасьцю сваю, так сказаць, рацыяналізацыю: паклаў ка меньчыкі з абодвух канцоў жалезу. Пацяпіце да аднаго канца, возьме ка меньчык, ачысьціць ім плуг ад прыліпшай зямлі і зноў ідзе да другога канца загону, дзе тымчасам чакае яго другі падрыхтаваны каменьчык.

Нібы дробязь—каменьчыкі, а столькі парадку ўносяць у работу. Радуе ў Міны Сімановіча роўна сьцеліцца.

Брыгадзір могіпаецца па зямлі і тырчае пальцам у Якубоўскага раўкаю.

— Чые гэта агрохі?

— Адкуль я ведаю.

— От-жа гэта твая рэльля?

— Мая.

— Зачыць і агрэхі твае.

— Эх!..—злуе Якубоўскі.

І ўходзіць з поля.

Вашкевіч пазірае на пакінутых коняй, на аратых, на чорныя крывыя палосы ўзаранай цалины.

— Дзе-ж мяжа Якубоўскага?

Ходзіць брыгадзір па полі, пытаецца, дзе пачынаецца ворыва Якубоўскага, дзе яно канчаецца і ледзь знаходзіць ён гэтыя межы крывых палос, агрохаў, якія тырчаць ва ўсіх бакох поля.

— Ня прыму зд Якубоўскага работы,—пагражае брыгадзір і яго падтрымліваюць усе калгаснікі.

— Ці-ж поле бясспрэчная балалайка, каб кожнаму лодыру даваць яго пазваць? Гнаць Якубоўскага з брыгады!

— Аштрафаваць яго.

У гэты дзень брыгадзір Вашкевіч з асаблівай старанасьцю выводзіў у трафэках нарану прозьвішча першага лодыра ў брыгадзе. А побач, на маленькай паперцы саромліва вывеў вінаватую лічбу 5,25 га. Аратыя ня выканалі нормы, хоць ля Конскіх могілак і лёгкая зямля.

— А што будзе з пералогамі за Асіпаўкай, дзе зямля цяжкая, — палохаўся брыгадзір.—Пэўна пры такой справе ня выробіш і трыццаці пяці сотак.

***

Любіць Сьцяпан Мыцько разбураць старыя межы, каменьні выварочваць.

Разбурае ён гэтыя межы з лейкай хлапечай зухаватасьцю, прыгаворваючы:

— От, я ўскладу вас, каб добра прала.

Сустракаюцца межы яшчэ сталыпінскія. А вось калі ўзяць валокі, з імі таксама намала папацеешь. Адных каменьняў колькі.

Асабліва шмат каменьня на Лопыльнскім полі, куды сёньня на баранаваньне выйшаў Мыцько.

Раней, калі пуляла на палёх, цягнулася барона аднаасобніка, каменьняў нібы ня так было шмат. Але гэта толькі здавалася. Дрэўляная барана спухала зямлю, ня ў сілах зачапіць каменьні. Пазьбірае аднаасобнік зьверху каменьні, пакладзе іх на мяжу. Зьверху чыста на полі, а ў глыбіні каменьне застаецца, зісьне ўсё жывое, не дае жыць расьліне.

А цяпер, як пойдзе Сьцяпана баранаваць на сваёй трохзьвенцы, як пачне выварочваць зямлю—усе каменьні з карэньнем выцягне. Поле аж бялёханькае.

Оустраў брыгадзір Сьцяпана пасьля работы.

— Ну, як баранавалі?

— Добра баранавалі.

— Нормы выканалі?

— Ты-ж нам даў Лопыльнскі вучастак на зьдзелычыну. Якая твая справа,—жартліва адказвае Сьцяпан.

— Як не моя справа?—пахмурыўся брыгадзір, усьміхнуўшы, мабыць, сбнецкую сутычку з Якубоўскім.— Я—брыгадзір...

— От, кажу я табе, брыгадзір, што нормы мы перавыканаем.

Вольна Сьцяпану баранаваць на полі. У яго—асобны вучастак. За гэты вучастак ён сам галавой адказвае. Сьцяпан памятае: якасьць добрая —атрымлівай 20 проц. прэміі, якасьць прыняя—атрымлівай на 20 проц. зьнижэньня. Добра Мыцьку.

А што рабілася на ворыве ля Конскіх могілак?

Акружылі калгаснікі брыгадзіра Вашкевіча, шумяць, крычаць, пытаюцца, чаму беспарадкі на ворыве. Зноў на сьцяпанава поле паказваюць.

— Што Мыцько? Ён адказвае за паўны вучастак. А мы што? Ходзім гуртам за плугамі адзін за адным. Іншы старацца, можа і норму перавыконвае, але дзе-ж яно, прэміяльные за яго стараньне? У агульны кацёл пішлю? Вазьмі для прыкладу таго сямата Якубоўскага. Папсаваў поле, нарабіў агрохаў і сам з поля з паўдня ўцёк. А чые яны, агрохі?

— Мы Якубоўскага аштрафуем, з брыгады выгнаём,—супакойвае брыгадзір.

— Аштрафуем, а далей што?

Пасьмейваецца Мыцько з аратых, з брыгадзіра Вашкевіча:

— Эх, аратыя! Ня ведаюць, як нарадак на полі навесьці. Павучыліся-б, як сёньня падраўнавалі зборычы кі і вазільнічкі каменьняў на Лопыльнскім полі. Недарма там норму перавыканалі.

Канцылярыя калгасу вечарам напаўняецца народам. Нахілёўшыся ніжа над маленькай кніжачкай, прыхіляй з сельсавету, сядзіць старшыня калгасу за сталом.

Сёньня на сходзе будуць зноў далей абмяркоўваць нормы выпрацоўкі і расцэнкі.

Сядзіць на лаўцы цішэнька і брыгадзір Вашкевіч, не адчэпіцца ад яго думка наконт нарадку на полі.

— От, сёньня нормы ня выканалі. Можа яны, нормы вялікія?

І ў той-жа час вецае, брыгадзір, што на ворыве ён, Міша Сімановіч, ды яшчэ некаторыя аратыя нормы свае выканалі.

Пасьмейваецца

КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА У КРАІНАХ КАПІТАЛУ

БАЎГАРЫЯ. У Сафіі, перад румынскай царквой, якая знаходзіцца пад апекаю румынскай місіі (у гонар 15 гадавіны анэксіі Бэсарабіі), у часе службы сабраўся шматлікі натоўп, які бурнымі крыкамі пратэставаў супроць прычынення Румынай нацыянальных меншасцей. Дэманстрацыя была расьсеяна паліцыяй.

***

ФІНЛЯНДЫЯ. Абоскі суд учора вынес прыгавор па справе **78 малады рабочых**, якія абвінавачваліся ў камуністычнай дзейнасьці. **71 рабочы прыгуджан да розных кар ад 6 месяцаў турмы да 7 год катаргі.** У адносінах 20 прысуд абвешчан умоўным. На судзе было выяўлена, што ў Фінляндыі шырока ўжываюцца правакацыі ў якасьці сродку барацьбы з рабочым рухам.

***

ЯПОНІЯ. Левыя прафсаюзы **Токіё, Асака, Кобэ** і іншых гарадоў вядуць энэргічную падрыхтоўку да першага мая, высоўваючы асноўнымі лёзунгамі барацьбу з вайной і фашызмам. Левыя прафсаюзы прапанавалі ўсім прафесыянальным саюзам правесьці сумесную дэманстрацыю. Некаторыя газэты чакаюць, што паліцыя, спасылаючыся на разгалосьсі паміж праф саюзамі, не дазволіць ніякіх дэманстрацый 1-га мая.

***

КІТАЙ. Паліцыя францускіх канцэсій зрабіла вобыск і разграміла «антыімпэрыялісцкую асацыяцыю па ратунку бацькаўшчыны» — аб'яднаньне антыімпэрыялісцкіх арганізацый, якое падаўна было арганізаванэ пад кіраўніцтвам Суэ Цзі-ліі (удавы Суэ Ят-сэна). Арыштавана 7 супрацоўнікаў. Забраны ўсе паперы. Некалькі дзён паліцыя трымала арышты ў сакроце.

***

ГІШПАНІЯ. У **Корыі** на нарадзе 13 округ (з агульнага ліку 18) было пастаноўлена парваць з рэфармісцкім прафсаюзам, які кіруецца сацыял-фашыстамі, і прыняць удзел у канфэрэнцыі прафсаюзнага адзінства, якая ў хуткім часе склікаецца. Гэтыя парваўшыя з рэфармістамі прафарганізацыі яднаюць 3 тысячы членаў. У Балахосе саюз сельска-гаспадарчых рабочых, які налічвае 2.500 членаў, выключан з рэфармісцкага аб'яднаньня за рэвалюцыйную дзейнасьць. Створан камітэт прафсаюзнага адзінства.

У **Памплове** група салдат прысуджана ў агульнай складанасьці да 45 год зьняволеньня ў катаржнай турме за адмаўленьне ад гнілой рыбы.

АБ МАІХ ПАМЫЛКАХ

Ліст у рэдакцыю

Шаноўны тав. рэдактар!

Дазвольце праз вашу газэту давесьці да ведама савецкай грамадзкасьці паступлае:

У часопісі «Заклік» № 2 зьмешчан мой артыкул «Праца над словам». Газэты «Зьвязда», «Чырвоная зьмена», «Рабочай», а таксама рад газарыпоў у прыватных гутарках зьвярнулі маю ўвагу на памылкі, дапушчаныя ў гэтым артыкуле. Уважліва прааналізаваўшы і прадумаўшы яго, я павінен адзначыць, што артыкул сапраўды мае некаторыя шасобныя памылкі.

Гэтымі памылкамі зьяўляюцца:

1. Ня клясавы, а фармалістычны падыход да мовы, дазначэньне яе толькі як сродку сувязі ў чалавечым грамадзтве, а ня як сродку клясавага змаганьня і панаваньня;

2. рэкамэндаваньне для папярэдняга моўных запасаў зборнікаў народнай творчасьці, крайных і літаратурных слоўнікаў без агаворкі пра строгае крытычнае выкарыстаньне гэтых матар'ялаў, паколькі значная частка з іх мае ў сабе шмат непатрэбнага і шкоднага, тадыянал-дэмакратычнага і вялікадзержаўніцкага.

Усе памянёныя памылкі майго артыкулу зьявіліся ў выніку нізкага ідэйнага ўзьвышэньня, а значыць, і спрыяюць клясаваму ворагу ў яго змаганьні супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Усьведамляючы ўсю шкодлівасьць да пушчаных мною памылак, я не магу, аднак, пагадзіцца з усімі тымі абвінавачваньнямі, якія высоўваюць мне С. Вялін і Дуброўскі ў «Чырвонай зьмене» (№ 63, 23-III, 1933 г.) і Вашневіч у «Зьвязьдзе» (№ 73, 3-IV 1933 г.), і катэгарычна пратэстую супроць кваліфікацыі майго артыкулу, як контр-рэвалюцыйнага выступленьня. Ні мая грамадзкая, ні мая літаратурная праца не даюць для гэтага вялікіх падстаў, наадварот, уся мая дзейнасьць апошніх год гаворыць пра маё рашучае змаганьне з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам (артыкул пра А. Бабарыку) і пра маё правільнае ў аснове разуменьне і вызначэньне ў мастацкай творчасьці сапраўднай нацыянальнай палітыкі (паэма «Армянка»).

Спадзяюся, што ў артыкуле пра сучасную літаратурную мову, над якім я цяпер працую, ня толькі больш шырока і поўна раскрыцьцяю свае памылкі, але і выпраўлю іх.

З прывітаньнем **Пятро Глебка.**

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя лічыць, што артыкул тав. П. Глебка ў № 2 «Заклику» «Праца над словам» зусім ня мае такіх памылковых выказваньняў, якія маглі-б даць падставу для такой суровай крытыкі, а тым больш для сур'ёзных палітычных абвінавачаньняў па адрасе пісьменьніка. Артыкулы Вялёна і Дуброўскага ў «Чырвонай зьмене» і Вішневіча ў «Зьвязьдзе», а таксама аналёгічныя артыкулы ў «Рабочем» і «ЛІМ'е», якія зьяўляюцца ўзорамі зусім нецярпімай, дробязна-прыдзірлівай, а частова і проста нядобрасумленнай крытыкі,—заслугоўваюць рашучага асуджэньня.

Што датычыць артыкулу т. Вішневіча ў № 73 «Зьвязды», дык ён надрукаван памылкова, па недагляду рэдакцыі, пасьля таго, як падобны-ж артыкул быў рэдакцыяй адхілен па паказаных вышэй матывах.

Наша ацэнка артыкулу тав. Глебка акрэсьлівае і нашы адносіны да рэдакцыі «Заклику», якая надрукавала гэты артыкул і падпала нападкам за гэта ў паказаных крытычных артыкулах.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Пляцы і вуліцы Менску 1 мая

Зацьверджаны асноўныя эсьвізы афармленьня цэнтральных пляцаў і вуліц Менску ў дні першамайскіх сьвят.

Пляц Волі афармляецца на тэмы: «Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!», «1 мая — баявы агляд рэвалюцыйных сіл пралетарыяту», «Савецкае будаўніцтва».

Спэцыяльная камбінаваная карта (шчыт) адлюструе становішча міжнароднага пралетарыяту, крызіс капіталістычнага сьвету на фоне магутнага росту Савецкага саюзу.

Цэнтральны сквэр будзе афармлен 2-ма электрыфікаванымі вітрынамі па пытаньнях міжнароднага становішча і сацыялістычнага будаўніцтва СССР.

Усебеларускі стадыён і парк культуры і адпачынку афармляюцца пад лёзунгамі: «Гатоў да працы і абароны» і «1 мая — сьвята сусьветнага пралетарыяту».

Ленінская і Савецкая вуліцы будуць упрыгожаны лёзунгамі, плякатамі і сьветавой ілюмінацыяй.

Прадпрыемствы, установы ў вітрынах, выстаўках, дыяграмах адлюструюць свой рост і дасягненьні па ўсіх участках работы.

Уся работа па ўпрыгожаньні горада праводзіцца беларускім аб'яднаньнем «Мастак» пад кіраўніцтвам гарадзкой першамайскай камісіі пры гарсавеце.

Кіно—на дапамогу пасеўнай

Кіноарганізацыі ўключыліся ў падрыхтоўку і правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі. Брыгада апаратараў Белдзяржкіно выпусьціла 6 нумароў кінохронікі, прысьвечанай падрыхтоўцы да сяўбы ў пасобных раёнах БССР. На час кампаніі вылучана 280 лепшых кіно-фільм і каротакамэтражак.

Для абслугоўваньня саўгасаў, калгасаў, МТС 1 адзіаасобнага сэктару мабілізаваны ўсе кіно-перасоўкі Белдзяржкіно. Лік перасовак павялічан да 410. Імі ўжо абслужана каля 302 тыс. гледачоў.

Пры 59 кіно-перасоўках ёсьць фота-вітрыны, якія ў ілюстрацыях паказваюць якасьць падрыхтоўкі да сяўбы па раёне. Такія-ж фота-вітрыны зроблены ва ўсіх кіно-тэатрах. За мінулыя тры месяцы выпушчана 152 сьветавыя газэты, прысьвечаныя сяўбе.

У дапамогу кіно-перасоўкам арганізавана 37 агітбрыгад, якія сумесна з кіномэханікамі перыядычна абслугоўваюць найбольш адсталыя сельсаветы, калгасы і саўгасы.

Улічваючы ролю і значэньне кіно-перасовак у перыяд сяўбы, грамадзкія арганізацыі на мясцох павінны ім дапамагчы.

Г. Гурбо.



На здымку: ГАЛОЎНЫ КОРПУС КРЫЧАЎСКАГА ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ.

На швэйнай фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску ўстаноўлена 5 новых істужкавых нажоў ленінградскага заводу «Вперед». Да гэтага часу на фабрыцы працаваў адзін нож замежнага вырабу.

На здымку: ЗАКРОЙШЧЫК ЛЯ НОВАГА ІСТУЖКАВАГА НАЖА.

Дэкаднік тэхнічнай кнігі

Беларускім аддзяленьнем «ОГИЗ» пра водзіцца з 15 красавіка дэкаднік тэхнічнай кнігі.

Асноўная мэта дэкадніка — прапагандаваць тэхнічную кнігу ў масы, давесьці бібліятэчкі тэхнічнага мінімуму да кожнага рабочага, папоўніць бібліятэкі пошкнага інжынэра, тэхніка, адміністратара.

Для правядзеньня гэтай работы арганізавана спэцыяльная брыгада, якая правяла ўжо значную работу па прасоўваньні тэхнічнай кнігі на заводзе імя Варашылава, на «Балышавіку», на абутковай фабрыцы і Эльфэдзе. У часе абедзенага перапынку былі праведзены гутаркі аб аўладаньні тэхнікай, ліквідацыі тэхнічнай непісьменнасьці і значэньні тэхнічнай кнігі.

У сувязі з дэкадніком вызначыўся некаторы перадым у тэхпрапагандзе. Тэхпропамі прадпрыемстваў набыта новая тэхнічная літаратура, папоўнены заводзкія і клюбныя бібліятэкі.

Новыя ВНУ, тэхнікумы, школы

На скончаньне будаўніцтва пачатых у 1932 г. будынкаў для ВНУ, тэхнікумаў і школ ФЗВ па лініі наркомаўсу лёгкай прамысловасьці БССР укладаецца каля 1 млн. руб.

У Менску будзе скончан будаўніцтва камбінат на 600 чал. Агульны кошт будаўніцтва — 2.400 тыс. руб.

У Магілеве заканчваецца будаўніцтва тэхнікум на 180 студэнтаў. Агульны кошт работ 400 тыс. руб.

У Гомелі будуецца фабзавуч будаўнікоў, у Віцебску — фабзавуч тэкстыльнікаў.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Па САВЕЦКАМУ САЮЗУ

Кіно, бібліятэка, радыё і піяніна ў савецкім экспрэсе



На здымку вагон адпачынку новага экспрэсу, ніадаўна ўступіўшага ў эксплёатацыю па лініі Масква—Тыфліс. Экспрэс абсталёван паводле апошняга слова захраняй тэхнікі. Радыё перадае цда па ўсіх вагонах.

Беразьнякоўскі камбінат даў першую партыю хлёракалія

БЕРАЗЬНЯКІ, 18. Абагаціцельная фабрыка 5-га каліяруднікa дала першую прадукцыю хлёракалія. Фабрыка будзе перапрапоўваць 1.250 тыс. тон сільвініту ў год. Па праектнай магутнасьці і мэханізацыі працэсаў фабрыка адна з першых у сьвеце. З пускам фабрыкі завяршаецца вытворчы працэс рудніка.

Іванаўская вобласьць пачала торфсэзон

ІВАНАВА, 18. 15 красавіка пушчан у пробную работу першы кран вялікага гідраторфу на торфбалоце Маркава-зборнае. У бліжэйшыя дні ўводзяцца ў работу ўсе 11 кранаў. Так рана торфсэзон адкрываецца ўпершыню.

ПАРАВОЗ НОВАЙ КАНСТРУКЦЫІ

ЛЕНІНГРАД, 17. Да 1 мая Днепрапятроўскі завод выпускае першы паравоз сыстэмы інж. **Пірына.** Прыехаўшы ў Ленінград інж. І. В. Пірын паведаміў нашаму карэспандэнту, што паравоз гэты зусім новай канструкцыі, угледае высокім каэфіцыентам карыснага дзеяньня і эканоміць 15-20 проц. апалу. Плошча пераграваецеля і паверхня нагрэву катла павялічаны ў сярэднім на 35 проц. Паравоз важыць 105 тон і будзе разьвіваць магутнасьць у 1.860 конскіх сіл.

Магутныя запасы гелія ў Дагестане

РАСТОЎ-ДОН. У **Дагестане** выкрыты каля пасёлку Ахці запасы гелія, неабходнага для дырыжаблёў. Брыгадай «Саюзбаза», пад кіраўніцтвам пра фэсара Кавалеўскага, устаноўлена, што новаадкрыты раён зьяўляецца самым магутным раёнам Саюзу па месцанаходжаньні гелія. На падрабязныя разведкі і пастаноўку вопытаў адпушчана 2.250.000 руб.

Скончан мантаж абсталяваньня капальні № 5

ПРАКОФ'ЕЎСК, 18. Закончаны работы і абсталяваньне паверхні капальні № 5. Капальня ўводзіцца ў эксплёатацыю ў красавіку. Яна павінна даць 12.000 тон вугалю. Уся транспартыроўка вугалю, пачынаючы з рудзічнага двара і канчаючы пагрузкай у чыгуначны вагон, поўнасьцю мэханізавана. Мэханізаваная пагрузка скараціла тэрміны загрузкі з 2-3 гадзін да 15 мінут. Па ступені мэханізацыі і транспартыроўкі вугалю капальня зойме першае месца ў Кузбасе.

Выканаць экспартны плян 2-га кварталу

Пастановай ЦК КП(б)Б ад 5 красавіка г. г. другі квартал абвешчан ударным па выкананьні экспартнага пляну БССР.

Гэта пастанова выклікана тым, што, ня гледячы на некаторы зрух у сакавіку, даўшы 106 проц. месячкага пляну экспарту, **агульны плян першага кварталу выканан толькі на 78,6 проц.** Да такога прарыву прывялі: заводы Белдрэву, якія рэалізавалі квартальны плян расьлінаўкі на экспарт толькі на 42,3 проц., запалкавыя фабрыкі—42,1 проц., гута «Кастрычнік»—38,1 проц., Саюзмаслапрам—0 проц., Аршанскі мясакамбінат—61 проц., плян загатовак пчаліны і конскага волосу выканан у першым квартале толькі на 60 проц.

Трэба адзначыць пасьпяховае выкананьне пляну першага кварталу па экспарту: ільнакудзелі (164 проц.), пушнафутровага сырцу (125,5проц.), бітай птушкі (104,4 проц.) і другарадным прамэкспарце (152,1 проц.).

Пастанова ЦК папярэджвае ўсе раённыя і кіруючыя органы супроць паўтарэньня меншых месцаў ў некаторых раёнах (**Ворша, Шклоў**) спроб аварыгуністычнага процістаўленьня экспарту задачам веснавой пасеўкампаніі.

Гэта папярэджаньне своячасова тэму, што рад экспартных задач другога кварталу поўнасьцю супадае па тэрмінах з разгарам веснавых палявых работ. Сюды адносяцца такія часткі экспартнага пляну, як загатоўка сырцу (крот, вадзяная крыса, суслік), загатоўка раньняга грыба-смарчка, яек, дзікарастучай лекавай сыравіны. Няма чаго ўжо і гаварыць аб такіх кампаніях, што складаюць нераз рыўную складаную частку пасеўнай кампаніі, як кантрактацыя і пасеў культурнай лексэравіны (кмін, наляр'яна, мальва) і забесьпячэньне якасьці пасеву ільну ў экспартных раёнах. Усе гэтыя задачы патрабуюць масавага актыўнага ўдзелу раённай, сельскай, калгаснай грамадзкасьці ў праверцы работы загатоўчых арганізацый.

Ніякімі заклінаньнямі і рэзалюцыямі ня ўдасца пакрыць прарываў у гэтай справе, калі яе арганізавана не правесьці адначасова і ў цеснай сувязі з усім плянам пасеўнай кампаніі.

Невялікі вопыт сакавіка (пасьля спэцыяльнай дырэктывы ЦК і СНК і праведзенай пры ЦК экспартнай нарады сакратароў РК сумесна з кіраўнікамі ведамстваў і важнейшых заводаў, працуючых на экспарт) відавочна паказаў, чаго можна дабіцца, калі адмовіцца ад самацёку і ўзяцца за канкрэтнае, апэрацыйнае кіраўніцтва экспартам у цэнтры і на мясцох. І толькі там, дзе простыя дырэктывы партыі і ўраду ня былі ўсвоены і ператвораны ў практычную работу (Белдрэў, Саюзмаслапрам, завод «Кастрычнік» і інш) рэзультаты работы пацягнулі ўніз паказальнікі ўсяго экспартнага пляну БССР і прывялі да невыкананьня пляну 1 кварталу. За раз ЦК КП(б)Б усклаў на сваіх упаўнаважаных па пасеўкампаніі на кожным раёне таксама і адказнасьць за арганізацыю і ход экспартнай работы.

Разам з РК і ГК, РВК і гарсаветамі, упаўнаважаныя ЦК павінны ажыўіць раённыя экспартныя нарады і ператварыць іх у дзейсныя апэрацыйныя штабы кіраўніцтва экспартнай работай у раёне.

І. Ф.

НА ПЕРШАЙ УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ ДРАМАТУРГАЎ

ВЫШЭЙ КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ!

18 красавіка — у трэці дзень нарады ў спрэчках выступалі т. т. **Стэльмах, Міровіч, Шашалевіч, Літвінаў, Брандтэйн, Дунец, Вольны, Досьвітны** і інш.

Тав. **Міровіч і Шашалевіч** у сваіх выступленьнях часткова спыняліся і на тых сваіх п'есах, аб якіх даклад чык тав. Вольскі таварыў падрабязна, аналізуючы іх, як зборнае беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмократызму.

Трэба сказаць, што як Міровіч, — аўтар п'ес «Кастусь Каліноўскі», «Мацюкевіч», так і Шашалевіч — аўтар п'есы «Апрэсаваная» ня ўскрылі з патрэбнай глыбіней буржуазна-нацыяналістычнай сутнасьці сваіх твораў. Замест расгорнутай, сапраўднай самакрытыкі тав. Міровіч усе свае памылкі зьвёў да малой палітычнай асьвечанасьці, а тав. Шашалевіч спасылаўся на ўплыў нашанёўскай літаратуры.

І моў рэзкую тав. Літвінаў, які адзначыў аб гэтых выступленьнях, як «нядобрых выступленьнях».

— Ён (Шашалевіч) прыстаў перад нам, — кажа тав. Літвінаў, — маленькім і бедненькім, нібы ня ведаючы, як ён стаў нацыкам. Нібы стаіць ён на голай зямлі і ветры дуюць з усіх бакоў. Гэта зусім не аналіз і зараз мы ў яраве патрабаваць большай пільнасьці, большай сьвядомасьці ў апэляці сваёй мінулай работы.

Тав. Дунец таксама падкрэсьліў слабую ўвагу выступаючых у спрэчках да пытаньняў клясавай барацьбы на фронце тэатру.

— Пытаньні клясавай барацьбы не павінны быць адарваны ад драматургіі, — кажа тав. Дунец. — Я ня ведаю, чаму гэтае пытаньне тут не закранаецца, можа таму, што драматургі нагрул адарваны ад тэатру, ад тэатральнага жыцьця.

На прыкладзе пастаноўкі БДЯТ «Віндзорскія свавольніцы» тав. Дунец ускрывае, як пастаноўшчык Фёдараў, зводзячы ідэі клясавай барацьбы да анэкдоту, робіць вылазкі на нашу сучаснасьць з тым разьлікам, каб кам прамэтаваць наш друк, нашы адносіны да савецкай культуры, да тэатру і інш.

— Прытым, — кажа тав. Дунец, — калектыў тэатру, асабліва камуністы, не заўважылі гэтага, прайшлі міма. Мы павінны павысіць клясавую пільнасьць. Гэта датычыць ня толькі крытыкаў, але і рэжысэраў і акторaў.

Тав. Дунец падкрэсьлівае, што нашы тэатры пакінулі абаблёную ўвагу ад-

дацць тэматыцы сучаснай актуальнай з тым, каб арыентаваць рабочую клясу, нашы калгасныя масы ў задачах сацыялістычнага будаўніцтва, каб сапраўды ператварыць наш тэатр у моцную зброю палітычнага выхаваньня найшырэйшых мас.

— Нашы тэатры, рыхтуючы якуюнебудзь клясычную рэч, павінны дамагацца, каб гэтыя паказы былі сапраўды масавымі, каб яны маглі прыцягнуць дзесяткі і сотні тысяч гледачоў.

У сваім выступленьні тав. **Брандтэйн** спыняўся на пытаньнях узаемаадносін літаратуры, драматургіі і тэатру, на пытаньнях у сувязі з драматургічнай дыскусіяй, якая разгарнулася зараз у Маскве.

Многія таварышы выступалі з крытыкай артыкулу тав. Літвінава ў газэце «Літаратура і мастацтва». «Наш рахунак драматургам», асноваючыся ў гэтым артыкуле рад памылак фармалістычнага характару, ілюзорнага разуменьня лёзунгу сацыялістычнага рэалізму, схалястычнай пастаноўкі гэтага пытаньня.

Нарада паслала адказ на тэлеграму сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Жаброўскага**, дзе гаворыцца: **«Мы, драматургі і працаўнікі тэатру, запэўняем вас, тав. Жаброўскі і ЦК партыі, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы прыкладзем усе сілы і здольнасьці для стварэньня магнітабудаў драматургіі, бо мы разумеем, што драматургія на даным адрэзку часу, у пэрыяд абвостранай барацьбы, набывае асабліва вялізарнае значэньне ў справе камуністычнага выхаваньня шырокіх працоўных мас, у справе барацьбы за пралетарскі інтэрнацыяналізм».**

Рэдакцыя газэты „Зьвязда" 22 красавіка 1933 году у 7 гадзін вечара

СКЛІКАЕ НАРАДУ

ПА ПЫТАНЬНІ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ ПА ЗАРПЛАЦЕ І ПЕРАВЫДАТКАВАНЬНЯ ФОНДАЎ ЗАРПЛАТЫ:

На нараду выклікаюцца з падрыхтаванымі матэрыяламі кіраўнікі банкаў і фінансавых установаў; кіраўнікі фінансавых сэктароў наркаматаў і аб'яднаньняў, прадстаўнікі фінсэкцыі НК РСІ і рэдактары шматтыражак і насьценгазэт прадпрыемстваў і ўстаноў Менску.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі, Савецкая 63. 3-й паверх прамэктар.

Менская гарадзкая камісія содзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадной справе і Менская гарадзкая ашчадная каса

ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ, ШТО

1-шы ТЫРАЖ

БЯСПРОЦАНТНА ВЫЙГРЫШНЫХ УКЛАДАЎ

адбудзецца 22 красавіка 1933 году роўна ў 7 гадз. веч., у памяшканьні клюбу мэтэлістаў (Ульянаўская вул.).

УВАХОД НА ТЫРАЖ ВОЛЬНЫ.

МЕНГАРНАМСОД,
МЕНГАРАШЧАДНАСА.

Памяшканьне дзярж. польскага тэатру імя 11 ліпня

РАЗЬВІТАЛЬНЫЯ ГАСТРОЛІ Расійскага драматычнага тэатру БВА

СЁНЬНЯ 20 красавіка

Сухода-Кабыліна

„СВАДЬБА КРЕЧИНСКОГО"

камэдыя ў 3-х дзеях.

Пачатак у 8 г. 30 м.

Білеты продаюцца ў рабочай касе і ў касе тэатру.

Чырв. Зорка Каса—ад 1 г. дня

Гукавы настаўніцкі кіно раман вытв. БІК СЛАВА СЬВЕТУ

Дзіцячы гукавы КІНО-ТЭАТР Каса з 1 г. дня.

ГУКАВАЯ ПРАГРАМА 1. НЕВЕРОЯТНО, НЕ ФАКТ 2. ПОШТА.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса—ад 4 г. дня

Замежны фільм Капітана ЛЯТУЧАЙ ЧАРАПАХІ

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"

ПАТ І ПАТАШОН у камэдыі знатныя падарожнікі

КІНО „СПАРТАК" Каса ад 2 г. 30 м. дня

Выдатны настаўніцкі фільм ВУЗЕЛ драма ў 6 частках

КОПЫЛЬСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖБАНКУ

абвяшчае аб ПРОДАЖЫ

маемасьці, належачай Копыльскаму плодагадаваму заводу на пагашэньне пратэрмінаваных пазык у суме 28000 р.

Продажа маемасьці наступная:

Віно ягаднае 4000 літраў на суму 24800 р.

Бочкі дубовыя 100 штук — 3000 р.

Маемасьць продаецца выключна арганізацыям сацыялістычнага сэктару.

За даведкамі зварачацца ў Капыльскае Аддзяленьне Дзяржбанку.

Кавуковая асацыяцыя дактараў

абвяшчае, што

22 красавіка, у 8 з пал. гадз. вечара, у памяшканьні первічнай клінікі адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Праф. Гінзбург Ф. і дац. Іргер „Уплывы вопыт пераліваньня крыві".

2) Дац. Іргер Ю. і д-р Дабруоміна: „Уплыў узяцьця крыві на дэнаравір".

На падставе пастановы прэзыдыуму БКС,

БОРКАВІЦКІ ЛЕСРАБКОП

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Усе ўстановы і асобы, якія маюць прэтэнзіі да лесрабкопу, павінны прад'явіць іх

да 25 красавіка 1933 г.

Пасьля ўказанага тэрміну прэтэнзіі зазнаньняцца ня будуць.

Адрас ліквідкому: ст. Борквічы, Дрысенскага раёну, БССР, ліквідком Борквіцкага лесрабкопу.

ЛІКВІДКОМ.

СНАБАЎТАДОРУ БССР

ПАТРЭБЕН

ст. бухгальтар.

Зварачацца: Менск, Савецкая, 82, Снабаўтадор.

СЕНЬНЯ,

20 красавіка г. г. у 7 г. вечара, у памяшканьні Арг. аддзелу Гарсавету (пакой № 12)

АДБУДЗЕЦЦА

СХОД ДЭПУТАЦКІХ ГРУП

прадпрыемстваў гор. Менску,

па пытаньням

пасеўкампаніі і сьвяткаваньня 1-га Мая.

Старшыням дэпутацкіх груп пад іх асабістую адказнасьць забясьпечыць своячасовую яўку дэпутатаў Гарсавету і актыву свайго прадпрыемства.

Арг. Масавы Аддзел Менгарсавету.

Польскі пэдагагічны тэхнікум імя Бр. Весалоўскага ў Менску

абвяшчае ПРЫЁМ

на 8-мячныя настаўніцкія КУРСЫ.

На КУРСЫ прымаюцца дзеці рабочых, калгаснікаў і адзіаасобнікаў-бедняко ў ва ўзросьце ад 15 год, якія скончылі 7 клясаў польскай ФЗС або ШКМ, таксама беларускую школу, якія валадаюць польскай мовай.

Для паступленьня на курсы патрэбны наступныя дакументы: пасьведчаньне сельсавету аб сац. становішчы, аб прыбытковым падатку на 1932 г., з паказаньнем у пасьведчаньні—на польскія настаўніцкія курсы; пасьведчаньне аб асьвеце, даведка аб нараджэньні, аб стане здароўя.

Кожны слухач забясьпечваецца інтэрнатам і стыпэндыяй у разьмеры 40 руб. у месяц. Кожны слухач павінен мець пасьцельныя прыналежнасьці, таксама 30 руб. на першы месяц да атрыманьня стыпэндыі.

Па атрыманьні дакументаў кожны паступаючы зараз-жа атрымае паведамленьне аб прыёме.

Заявы з дакументамі прымаюцца да 30 красавіка г. г.

Кожны польскі с-с., калгас, саўгас, камсамольская ячэйка павінны паслаць на курсы сваіх прадстаўнікоў.

Дакументы накіроўваць па адрасе: Менск, Савецкая, 144, дырэкцыі польпэдтэхнікуму.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ТАБЛІЦА

15-га тыражу выйгрышаў пазыкі „3-га рашаючага году пяцігодкі"

(Бяспроцантна-бяспройгрышны выпуск)

Тыраж выйгрышаў адбыўся 10 і 11 красавіка 1933 г.

№№ серый	№№ абл.	Разьмер выйгр.	№№ серый	№№ абл.	Разьмер выйгр.	№№ серый	№№ абл.	Разьмер выйгр.
0017	43*)	200	3496	08*)	500	6256	66*)	200
0059	51*)	200	3708	19*)	200	6372	05*)	500
0136	05*)	200	3720	1—100	50	6603	1—100	50
0137	51*)	500	3848	22*)	200	6997	47*)	500
0229	40*)	200	3942	87*)	200	7070	99*)	200
0342	84*)	200	4440	26*)	200	7107	71*)	500
0355	72*)	200	4489	1—100	100	7162	45*)	200
0532	18*)	200	4670	03*)	500	7338	37*)	200
0771	23*)	500	4773	95*)	500	7420	1—100	50
0832	04*)	500	4792	66*)	200	7429	66*)	500
1283	14*)	200	4817	1—100	50	7749	57*)	200
1710	96*)	200	4956	63*)	500	7772	29*)	200
1728	94*)	200	4973	75*)	500	7933	1—100	50
1963	22*)	500	5139	77*)	200	7911	36*)	200
2159	38*)	200	5188	1—100	50	7984	99*)	200
2230	59*)	200	5203	91*)	200	8079	57*)	500
2416	83*)	200	5345	30*)	500	8098	15*)	200
2532	33*)	200	5416	48*)	500	8554	58*)	200
2608	30*)	500	5626	39*)	200	8646	71*)	200
2612	15*)	500	5629	70*)	500	8853	78*)	500
2891	40*)	200	5715	68*)	200	9104	91*)	200
2976	03*)	200	5769	99*)	200	9196	59*)	200
3166	32*)	200	5778	90*)	200	9538	26*)	200
3271	52*)	200	6218	35*)	200	9619	83*)	200
3316	61*)	200	6244	94*)	200	9769	100	50
3455	50*)	200	6254	48*)	500	9918	33*)	500

*) Астатнія 99 нумароў аблігацый гэтай сэрыі выйгралі па 20 руб. кожны.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ І ДЗЯРЖКРЭДЫТУ БССР.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337